Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

11 ЛІПЕНЯ 2007 г.
СЕРАДА

№ 127 (25992)

Кошт 440 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У ЯКАСЦІ ГАЛОЎНАГА ПЫТАННЯ Ў ДЫЯЛОГУ З ЕС БЕЛАРУСЬ БАЧЫЦЬ ЭНЕРГЕТЫЧНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 10 ліпеня даў інтэрв'ю французскай газеце «Монд».

Гутарка Прэзідэнта з намеснікам галоўнага рэдактара газеты «Монд» па замежнай тэматыцы Крыстофам Шатло доўжылася больш за дзве з палавінай гадзіны. Аляксандру Лукашэнку было зададзена 47 пытанняў, якія датычыліся шырокага спектра тэм: узаемаадносінаў Беларусі і Еўрасаюза, магчымасцяў наладжвання сур'ёзнага дыялога паміж Беларуссю і Францыяй, супрацоўніцтва рэспублікі з краінамі-суседзямі, якія ўступілі нядаўна ў ЕС, узаемадзеяння Беларусі з новымі знешнепалітычнымі партнёрамі, у тым ліку з Венесуэлай, будаўніцтва ў рэспубліцы атамнай электрастанцыі, уступлення Беларусі ў СГА.

Французскі журналіст цікавіўся тым, як Беларусь пераадолела наступствы істотнага павелічэння цэн на расійскія энерганосьбіты, перспектывамі далейшага саюзнага будаўніцтва. Аляксандр Лукашэнка выказаў сваю думку адносна размяшчэння элементаў ПРА ЗША ў еўрапейскіх краінах, прасоўвання НАТА на Усход, сітуацыі ва Украіне і магчымых перспектыў далейшых аб'яднальных працэсаў на постсавецкай прасторы.

У час інтэрв'ю былі закрануты і актуальныя пытанні, якія датычацца ўнутрыпалітычнага жыцця рэспублікі: узаемаадносінаў улады і апазіцыі, аптымізацыі сацыяльных ільгот, прычын адсутнасці ў Беларусі так званай партыі ўлады.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, Беларусь будзе вітаць сур'ёзны дыялог з новым кіраўніцтвам Францыі. «Хацелася б, каб новае французскае кіраўніцтва, вывучыўшы сітуацыю і тое, што адбываецца сёння паміж Беларуссю і Еўрасаюзам, Беларуссю і Францыяй, зрабіла з гэтага адпаведныя высновы. Мы будзем вітаць, калі новае кіраўніцтва Францыі зверне на гэта ўвагу, і мы будзем весці сапраўды сур'ёзны, салідны дыялог, як гэта было прыкладна на 8—10 гадоў таму», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

На думку Прэзідэнта, пашырэнне НАТА і размяшчэнне элементаў ПРА ЗША на тэрыторыі Польшчы і Чэхіі — гэта, перш за ўсё, пытанне бяспекі саміх еўрапейцаў, а не Беларусі. «ЗША, не параіўшыся са сваімі еўрапейскімі партнёрамі, узмацняюць прысутнасць у гэтым рэгіёне. Еўрапейцы робяць выгляд, што гэтага не заўважаюць, маўчаць. Але мы ведаем, чым можа абярнуцца гэта маўчанне», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, Беларусь сёння адводзіць энергетычнаму супрацоўніцтву галоўнае месца ў дыялогу з Еўрасаюзам.

«Пытанне забеспячэння энерганосьбітамі з'яўляецца найважнейшым перш за ўсё для еўрапейцаў, і гэтай праблемай еўрапейцы павінны былі даўно заняцца, не чакаючы крызісу ў адносінах паміж Беларуссю і Расіяй, які балюча ўдарыў па ЕС, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — У якасці галоўнага ў дыялогу Беларусь—Еўрасаюз мы паставілі менавіта гэта пытанне, а не нейкія эфемерныя праблемы. Напэўна, еўрапейцы з-за інертнасці пакуль не заўважаюць гэтых праблем. Але паверце, гэтыя праблемы ўдараць па тых палітыках, якія ў ЕС сёння іх не заўважаюць».

«Спадзяюся, што новы прэзідэнт Францыі і новае кіраўніцтва, энергічнае, маладое, убачаць гэтыя праблемы і тады ацэняць Беларусь», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Газета «Монд» — уплывовае штодзённае грамадска-палітычнае выданне Францыі, якое публікуе матэрыялы на розныя тэмы: палітычныя, эканамічныя, культурныя, а таксама размяшчае сур'ёзныя аналітычныя агляды. Заснаваная ў 1944 годзе, сёння гэта газета з'яўляецца лідарам па тыражу сярод такіх выданняў, апярэджваючы такія буйныя французскія газеты, як «Фігаро» і «Ліберасьён». Цяпер у штаце рэдакцыі газеты працуюць каля 4000 супрацоўнікаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў лётчыка-касманаўта СССР Пятра Клімука з 65-годдзем

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў лётчыка-касманаўта СССР двойчы Героя Савецкага Саюза Пятра Клімука з 65-годдзем.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што, выконваючы адказныя і складаныя заданні на арбіце, знаходзячыся на працягу многіх гадоў у авангардзе касмічнай галіны, Пётр Клімук унёс вялікі ўклад у асваенне космасу, развіццё навукова-тэхнічнага патэнцыялу Айчыны. «Беларусь ганарыцца Вамі, адным з самых праслаўленых сваіх землякоў, і асабліва ўдзячна Вам за садзейнічанне ўмацаванню дружбы і ўзаемаразумення двух брацкіх народаў», гаворыцца ў віншаванні.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

З «КУПАЙЛІЦАЙ», «АЎРОРАЙ» І ЗАПАРОЖЦАМІ

10 ліпеня ўвайшло ў летапіс сёлетняга «Славянскага базару» не проста як тэматычны дзень, а як сапраўдны трыумф Украіны. Да вялікага гала-канцэрта майстроў мастацтваў «Купайліца» дабавіліся два кінапаказы — «Запарожац за Дунаем» Мікалая Засеева-Рудзенкі і «Аўрора» Аксаны Байрак (апошняя карціна ўпершыню за многа гадоў была дапушчана да ўдзелу ў намінацыях «Оскар» — нягледзячы на спазненне з заяўкай на 3 тыдні; праўда, узнагарод усё адно не ўзяла). Але галоўнай нагодай для гонару і радасці ўкраінская дэлегацыя справядліва лічыла конкурснае выступленне 17-гадовай спявачкі Наталлі Краснянскай (на фота), якая па выніках двух дзён набрала 158 балаў і прынесла Украіне перамогу.

«Было вельмі цяжка заснуць, увогуле гэтыя два дні я вельмі хвалявалася, хадзіла сама не свая, — расказала Наташа. — Тое, што ў мяне найбольшая сума балаў, стала вялікай нечаканасцю, я не спадзявалася на такі выхід, але выніку вельмі рада — перамога ўжо ў нас, не важна, будзе гэта гран-пры або першае месца, як суддзі скажуць». Дарэчы, маладая артыстка прыгадала, што жараб'ёўка канкурсантаў адбывалася ў «шчаслівы дзень» 07.07.07, дый нумар ёй таксама выпаў сёмы. Як тут не паверыць ва ўдачу?

Што да конкурсу ўвогуле, то, як адзначыў член журы, народны артыст Украіны, рэктар Данецкай музычнай акадэміі Вячаслаў Заяводзін, «усё праходзіць адкрыта і празрыста, падабралася вельмі кампетэнтнае журы, у нас не было спрэчак, якія ацэнкі выстаўляць і нават не было магчымасці параіцца і «падыграць» камусьці. Усе засталіся задаволеныя вынікамі». Тое, што выканаўцы з кансерваторскай адукацыяй (сёлета гэта, скажам, Мерунас з Літвы і Віталь Мачунскі з Малдовы) традыцыйна атрымліваюць даволі нізкія балы, украінскі кампазітар патлумачыў фарматам самога конкурсу: паміж оперным выкананнем і эстраднай песняй заўважная розніца, а ў Віцебску — менавіта конкурс эстраднай песні, і патрабаванні на ім да ўсіх адпаведныя.

У гала-канцэрце, які ўкраінскія пастаноўшчыкі стылізавалі пад Купальскае свята, віцябчанам і гасцям фестывалю была прапанавана праграма сапраўды на ўсе густы: ад народных артыстаў кшталту Мікалая Гнацюка, Мікалая Мазгавога, Валянціны Сцепавай, Наталлі Бучынскай, заслужаных артыстаў Ірыны Білык, Дзмітрыя Клімашэнкі, Юрыя Фёдарава — да зусім маладых выканаўцаў Мікі Ньютан, Ірыны Шынкарук, Маі Мігаль, гуртоў «Авіятар» і «SMS». А фальклорны ансамбль «Кобза», напрыклад, выступіў... дуэтам з Анатолем Ярмоленкам — дакладней, саліст ансамбля Дзмітрый Літвінец праспяваў разам з салістам «Сяброў» песню «Рідна мати моя».

Дарэчы, як расказалі прадстаўнікі ўкраінскага нацыянальнага тэлебачання, трансляцыі падзей «Славянскага базару ў Віцебску» па рэйтынгу ў іх даганяюць канцэрты «Еўрабачання», а з улікам перамогі ўкраінскай артысткі, напэўна, могуць і абагнаць іх. У адрозненне ад расійскіх калег, якія зрабілі пэўную «цэнзуру» (тэлеканал «Расія» выразаў з трансляцыі канцэрта адкрыцця выступленне Веркі Сярдзючкі), украінскае тэлебачанне пакажа фестываль па максімуму: так, адкрыццё і закрыццё «Славянскага базару ў Віцебску», Дні культуры Расіі, Украіны і Беларусі, конкурс маладых выканаўцаў транслююцца ў прамым эфіры, а канцэрты зорак «Еўрабачання» і «Танцуй да раніцы» будуць прапанаваны ўкраінскім тэлегледачам крыху пазней. «Мы дэмакратычная дзяржава, нікога і нічога з эфіру не выразаем», — падкрэслілі прадстаўнікі дэлегацыі Украіны.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

(Працяг тэмы на 6-й стар.)

фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СП ЗАО «Юнисон»

производитель малотоннажных коммерческих автомобилей марки «Люблин-3» в РБ, предлагает:

- Люблин-3324, грузопассажирский комби (6 мест; 2,4 TD-Евро-3; 5 МКПП TS5-21; г/у JKS, грузоподъем. 840 кг)
- Люблин-0554 шасси, с возможностью установки бортового тентованного кузова, изотермического фургона, специального оборудования (число мест 3; дв. Iveco 2.8 TD-Евро-3; грузоподъем. 1530, объем груз. отсека 10,4 м. куб.)

Республика Беларусь, 223010, п. Обчак, Минский р-н отдел продажи: 217-52-41, 210-08-59, ф. 210-08-60
e-mail: unison-co@mail.ru

Гран-пры — ёсць!

Нягледзячы на тое, што пасяджэнні журы афіцыйна праходзяць пры зачыненых дзвярах, некаторыя зместкі становяцца вядомымі. Так, гран-пры конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні ў гэтым годзе ўсё ж паабяцалі прысудзіць і прысудзілі — Наталлі Краснянскай з Украіны.

Па суме двух дзён аднолькавую колькасць балаў набралі беларус Георгій Калдун і славенская спявачка Нушка — 156. Паміж імі і была падзелена I прэмія — па 3 тысячы долараў кожнаму. II прэмію і 4 тысячы долараў прысудзілі самай малодшай канкурсантцы, 16-гадовай Аліне з Румыніі, у якой было 153 балы. Па 152 «зарабілі» паляк Себасцьян Плявіньскі і Ана Міленковіч з Сербіі. Яны падзялілі III прэмію і атрымалі па адной тысячы прызавых. У беларускі Ганны Благавай — 151 бал.

Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2007» адбылася ўчора вечарам у Віцебскай абласной філармоніі. Акрамя гран-пры і першых трох прэмій, свае прызы — сучасныя ноўтбукі расіяніну Радзівону Роусу і беларусу Георгію Калдуну — уручыў Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы. Гэтаксама быў вызначаны лёс спецыяльнай прэміі імя Уладзіміра Мулявіна. Яна дасталася Радзівону Роусу.

Ва ўрадзе

Сяргей СІДОРСКІ:

«Развіваючы беларускую аўтамабільную прамысловасць, неабходна глядзець гадоў на 10 наперад, а не параўноўваць сённяшнія дасягненні з днём учарашнім»

У нашай краіне аўтамабілебудаванне, самым цесным чынам каапераруючыся з прадпрыемствамі металургічнай, электратэхнічнай, хімічнай, электронай, лёгкай і іншых галін прамысловасці, усё больш прыкмета становіцца своеасаблівым рухавіком усёй эканомікі.

З-за знешняй рэсурснай залежнасці аўтамабілебудавання краіны, недастатковага ўнутранага попыту на яго прадукцыю, высокай канкурэнцыі на знешніх рынках актуалізуецца праблема пошуку шляхоў і стратэгій развіцця гэтай галіны. Галоўнае тут — не задавальняцца дасягнутым, не жыць выключна сённяшнім ці нават заўтрашнім днём — працаваць на перспектыву, каб не апынуцца нечакана ў аўтсайдарах. Менавіта таму па даручэнню ўрада краіны быў распрацаваны праект Дзяржаўнай праграмы развіцця аўтамабільнай прамысловасці Беларусі на 2007—2010 гады. Ён абмяркоўваўся ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, якое прайшло пад старшынствам прэм'ера Сяргея Сідорскага.

Да 2010 года ў краіне будуць створаны магутнасці для выпуску 51 тысячы аўтамабіляў. Паводле слоў Анатоля Русецкага, міністра прамысловасці, штогод плануецца выпускаць 31 тысячу аўтамабіляў МАЗ, 600 аўтамабіляў Мінскага завода колавых цягачоў і да 20 тысяч легкавых аўтамабіляў «Саманд» на прадпрыемстве «Юнісон». Акрамя таго, як вядома, існуе даручэнне па стварэнню паралельна вытворчасці легкавых аўтамабіляў разам з Кітаем. Аднак канкрэтныя аб'ёмы вытворчасці тут пакуль невядомыя. Таксама ў рамках праграмы прадугледжваецца выпуск штогод 2,5 тысячы аўтобусаў МАЗ, 450 аўтобусаў «Нёман» і такая ж колькасць аўтобусаў Гомельскага аўтарамонтнага завода — будзе дзейнічаць вытворчасць аўтобусаў чатырох класаў: вялікіх, сярэдніх пасажырскіх, міжгародніх, аэрадромных. Уся новая беларуская тэхніка, заявіў А. Русецкі, будзе аснашчана новымі кабінамі, мастамі, мадэрнізаванай тармазной сістэмай, каробкай перадач, электронікай. Аб'яднанне Белаўтамаз, дарэчы, плануе цалкам перайсці на машыны з рухавікамі ЕЎРА-3 і асвоіць рухавікі ЕЎРА-4. Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі асабліва падкрэсліў важнасць найхутчэйшага наладжвання рухавікоў стандарту ЕЎРА-4: «Мы павінны дакладна ўяўляць сабе, што неабходна для гэтага зрабіць, якія выкарыстаць рэсурсы, ці дастаткова ўкладзена грошай для таго, каб Мінскі маторны завод быў канкурэнтаздольны і на постсавецкай прасторы і на больш аддаленых геаграфічна рынках». Паводле слоў кіраўніка беларускага ўрада, пры рэалізацыі гэтай праграмы неабходна арганізаваць і ўласную вытворчасць электронікі для аўтамабіляў. Усё — начынка, дызайн, камфорт, бяспека — павінны адпавядаць еўрапейскаму ўзроўню, каб мы маглі неадкладна рэагаваць на любыя патрэбнасці рынку — і ўласнага, беларускага, і знешняга.

Асаблівую ўвагу С. Сідорскі звярнуў на развіццё рухавікоў, якія працуюць на біяпаліве. «Беларусі як мага хутчэй неабходна пераходзіць да стварэння рухавікоў на біяпаліве. Гэта вельмі важная тэма, у Еўрасаюзе прынята рашэнне, што біяпаліва павінна складаць не менш як 15 працэнтаў». Пры гэтым, паводле слоў прэм'ер-міністра, «трэба больш актыўна прасоўваць нарматыўную базу па выкарыстанню гэтага віду паліва, бо пакуль у Беларусі няма яе стандарту». Галоўнае тут — не страціць час, інакш акажамся неканкурэнтаздольнымі». Сяргей Сідорскі таксама запатрабаваў, каб міністэрства прамысловасці і адпаведныя прадпрыемствы выпускалі такія біяпаліўныя рухавікі, якія можна было б без праблем пастаўляць і ў Расію, і ў Кітай, і ў Еўропу». «Мы павінны ісці наперадзе канкурэнтаў і глядзець, што будзем мець праз 5—10 гадоў, а не параўноўваць дасягнутае сёння з учарашнім днём», — падвёў вынікі пасяджэння прэм'ер-міністр Беларусі.

Фінансаванне праграмы развіцця беларускага аўтапрама прадугледжваецца ў аб'ёме каля 1 трыльёна рублёў.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

Алег Праляскоўскі:

«АДКРЫТАЯ РАЗМОВА З НАРОДАМ — БЕЗУМОЎНАЯ ПРЫМЕТА СІЛЫ ЎЛАДЫ»

Адкрытая размова з народам — безумоўная прымета сілы ўлады і надзейны залог даверу людзей. Аб гэтым заявіў памочнік Прэзідэнта Беларусі — начальнік галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Алег Праляскоўскі ў гутарцы з журналістамі.

«Называць рэчы сваімі імёнамі і гаварыць аб праблемах прама і шчыра — самая сумленная і самая лепшая інфармацыйная тактыка», — пераканаўся Алег Праляскоўскі.

Ён падкрэсліў, што Беларусь — адна з нямногіх краін свету, дзе дэбаты на важнейшых нарадах у Прэзідэнта паказваюць практычна ў рэжыме прамога эфіру. «Нашы грамадзяне ўсё бачаць і чуюць самі, і самі могуць ацаніць тое, што адбываецца», — сказаў памочнік кіраўніка дзяржавы.

Пры гэтым ён акцэнтаваў увагу на тым, што і ў апошнія месяцы ўлада нічога не ўтойвала ад грамадзян — ні складанасць перагавораў з Расіяй па пытаннях энергетыкі, ні магчымыя праблемы ў эканоміцы. «Нашы грамадзяне яшчэ ў пачатку года пачулі дакладную пазіцыю кіраўніка дзяржавы — ніякага абвалу, ніякага крызісу не будзе. Гэта цалкам выключана. Так яно і адбылося», — адзначыў Алег Праляскоўскі.

«Нашы апаненты спадзяваліся, што мы адмаўчымся па пытаннях АЭС і льгот. Гэта неразумныя надзеі. Навошта ўладзе адмоўчвацца, калі нам ёсць што сказаць? Калі рашэнні прымаюцца ў інтарэсах большасці. Калі ёсць выразныя і дакладныя лічбы, якія ўсё расстаўляюць па сваіх месцах».

Паводле яго слоў, ні пра якую «савецкую сістэму ідэалагічнай работы» ў Беларусі не можа быць і гаворкі. Сёння чалавека можна толькі пераконваць, цудоўна разумеючы, што ў яго заўсёды знойдзецца маса крыніц іншай, альтэрнатыўнай інфармацыі. Аб гэтым заявіў памочнік Прэзідэнта.

Памочнік кіраўніка дзяржавы таксама падкрэсліў, што інфармацыйная прастора Беларусі свабодная. «У нас распаўсюджваюцца дзесяткі і нават сотні недзяржаўных друкаваных выданняў — і мясцовых, і замежных. У кніжных магазінах прадаецца самая разнастайная літаратура. Мільёны людзей глядзяць дзесяткі тэлеканалаў па спадарожнікавай сувязі або ў мясцовых кабельных сетках. У рэшце рэшт, ёсць Інтэрнэт, колькасць карыстальнікаў якога павялічваецца гіганцкімі тэмпамі», — сказаў Алег Праляскоўскі.

Пры гэтым ён адзначыў, што фактычна і дзяржаўныя СМІ, і «ідэалагічная вертыкаль» працуюць у рэальна канкурэнтным асяроддзі, і з цягам часу жорсткасць канкурэнцыі будзе толькі ўзрастаць. Таму ўжо сёння варта самым энергічным чынам асвойваць тыя сферы, якія будуць панаваць заўтра, перш за ўсё Інтэрнэт.

Паводле слоў Алега Праляскоўскага, беларускія журналісты часам не паспяваюць за тэхнічным прагрэсам, а Інтэрнэт-версіі друкаваных выданняў слаба наведваюцца. «Лічу, што ў бліжэйшы час нам трэба будзе сур'ёзна папраўдзе стан спраў у гэтай сферы», — падкрэсліў памочнік Прэзідэнта Беларусі.

«Калі б беларуская апазіцыя пасапраўднаму жадала супрацоўнічаць з уладай на карысць Беларусі, то перш за ўсё яна павінна была б перастаць абліваць граззю ўласную краіну за мяжой», — сказаў Алег Праляскоўскі.

Ён падкрэсліў, што і ў Еўропе, і ў ЗША цудоўна разумеюць, што нацыянальныя інтарэсы павінны быць заўсёды вышэй за скарацечныя палітычныя сваркі. «На жаль, да ўзроўню цывілізаванай еўрапейскай апазіцыі нашы «мясцовыя кадры» не дараслі. Яны робяць роўна наадварот — раз'язджаюць па свеце і з году ў год нудна ўпрошваюць увесці то адны, то другія санкцыі супраць Беларусі».

У якасці апошняга такога прыкладу памочнік Прэзідэнта назваў дзейнасць лідараў так званых «незалежных беларускіх прафсаюзаў». «Чым яны павінны займацца? Абаронай інтарэсаў працоўных. Замест гэтага яны цалкам адкрыта дабіваліся таго, каб нашу краіну пазбавілі гандлёвых прэферэнцый ЕС. Гэта значыць, адкрыта дзейнічалі супраць інтарэсаў работнікаў, супраць тых, каго павінны абараняць. І пасля гэтага здзіўляюцца, што рэйтынг іх падтрымкі ўнутры Беларусі імкліва набліжаецца да нуля», — адзначыў Алег Праляскоўскі.

Паводле яго слоў, жаданне апазіцыянераў гаварыць з уладай дыктуецца простай акалічнасцю. Апошнім часам і ЕС, і ЗША скарачаюць аб'ём фінансавання беларускай апазіцыі, усё больш пераконваючыся ў яе поўнай недзеяздольнасці. «Адпаведна, у апазіцыі два выйсці — або выводзіць дзесяткі тысяч на вуліцы (але гэта не атрымліваецца, паколькі людзі нікуды выходзіць не хочуць), або прасіцца на дыялог з уладай (каб потым паказаць сваім спонсарам — паглядзіце, улада з намі мае справу, значыць, мы — сіла...)», — растлумачыў памочнік кіраўніка дзяржавы.

Кар. БЕЛТА.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У САНКТ-ПЕЦЯРБУРГ МОГУЦЬ ВЯРНУЦЦА ТАЛОНЫ НА... ХЛЕБ

Аб гэтым заявіў учора першы намеснік старшыні гарадскога камітэта эканамічнага развіцця Юрый Ракаў. Такім чынам чыноўнік пракаментаваў сітуацыю з маючым адбыцца павышэннем цаны на хлеб у Расіі.

«У далейшым у Пецярбургу магчыма ўвядзенне картак,— заявіў Юрый Ракаў, але тут жа паправіў сам сябе,— не, гэта непрыгожа гучыць: хутчэй — прадуктовых талонаў, як у ЗША, для малазабяспечаных сем'яў». Паводле слоў чыноўніка, губернатар Валянціна Матвіенка дала даручэнне пралічыць магчымасць выдзялення сродкаў для закупкі зерня з рэзервовага фонду. Юрый Ракаў не ўдакладніў, калі менавіта магчыма ўвядзенне такіх мераў.

Ужо сёння хлебазаводы нясуць страты — яны купляюць муку па новых цэнах (па Пецярбургу цана вырасла на 50—70 працэнтаў), а прадаваць хлеб вымушаны па ранейшых кантрактах.

Паводле прагнозаў экспертаў, пшанічны хлеб у Пецярбургу вырасце на 25 працэнтаў, на ржаны павышэнне будзе мінімальным: абяцаюць, што яно не перавысіць 10 працэнтаў. Улады афіцыйна аб'явілі, што рыхтуюцца да новых закупак, павялічваюць рэзерв зерня ў горадзе для рэгуляцыі цаны. Гэта тлумачыцца таксама сітуацыяй на сусветным рынку зерня: за апошні месяц цана на тону зерня пшаніцы выраслa са 180 долараў да 240. Павышэнне звязана з неспрыяльным для ўраджаю 2007 годам.

ЧЫРВОНАЯ МЯЧЭЦЬ У ПАКІСТАНЕ ЗАХОПЛЕНА

З пачатку ліпеня ў сталіцы Пакістана Ісламабадзе адбываюцца сутыкненні паміж паліцыяй і радыкальна настроенымі студэнтамі рэлігійнай школы пры мячэці Лаль Масджыд, якія на працягу некалькіх месяцаў вялі кампанію за ўстанаўленне законаў шарыяту ў краіне.

5 ліпеня мячэць захапілі каля 30 узброеных тэрарыстаў, якія ўтрымлівалі ў заложніках 150 студэнтаў і 60 дзяцей. Каб пазбегнуць чалавечых ахвяраў, у мячэць для правядзення перамоў была адпраўлена камісія.

Аднак перамовы закончыліся беспаспяхова, і 10 ліпеня пакістанская армія пачала штурм мячэці. У час штурму ваенным удалося захапіць практычна ўвесь комплекс, аднак тэрарысты на чале з Абдулам Рашыдам Газі забарыкадзіраваліся ў падвалах і працягвалі аказваць упартае супраціўленне. Учора вечарам штурм усё яшчэ працягваўся, колькасць забітых складала каля 50 баевікоў і 9 спецназаўцаў.

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

АСБ «Беларусбанк» информирует, что
с 9 июля 2007 года снижены
процентные ставки
по вновь заключаемым кредитным договорам в иностранной валюте.

Дополнительную информацию можно получить на веб-сайте банка
http://www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 27.10.2006 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.

ЭКАЛОГІЯ — ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Ахове навакольнага асяроддзя на вытворчым аб'яднанні «Беларускалій» надаецца сур'ёзная ўвага

Б ЕЗ усялякіх ваганняў вытворчае аб'яднанне «Беларускалій» можна назваць не толькі адной з візітных картак нашай дзяржавы, а і «брэндам» сусветнага маштабу. Напэўна, цяжка знайсці чалавека, які не цікавіцца справамі айчынных шахцёраў. Паводле апошніх даных, прадукцыя рэспубліканскага прадпрыемства «Вытворчае аб'яднанне «Беларускалій» пастаўляецца ва Усходнюю Азію, Еўропу, Паўднёвую Афрыку, краіны Міжземнамор'я, Кітай, Індыю, Паўднёвую і Паўночную Амерыку — усяго ў больш чым паўсотню дзяржаў. Геаграфія паставак сапраўды ўражвае — напэўна, вытворцаў, якія маюць такі рынак збыту, можна пералічыць па пальцах. Не менш важная задача — гэты рынак утрымаць і з цягам часу павялічваць колькасць гандлёвых сувязяў. «Беларускалій» са сваёй задачай спраўляецца паспяхова — зараз прадпрыемства актыўна развіваецца, павялічваючы аб'ёмы вытворчасці і паляпшаючы якасць.

Забеспячэнне пытанняў якасці — стратэгічная ўмова. Яе выкананне жорстка адсочваецца, мабыць таму ўдаецца трымаць высокі ўзровень: беларуская прадукцыя на роўных па якасных характарыстыках з замежнымі прадпрыемствамі, а па шэрагу пазіцый іх пераўзыходзіць. Гэта вызначальны момант для спажыўцоў, якія абгрунтавана робяць свой выбар — па выніках мінулага года на долю «Беларускалія» прыпадала 16 працэнтаў сусветнай вытворчасці калійных угнаенняў і 17 працэнтаў сусветных экспартных паставак. Па аб'ёму вытворчасці калійных угнаенняў і па аб'ёму экспарту Беларусь займае трэцяе месца. Як бачым, вынікі работы «Беларускалія» сапраўды ўражваюць, за ўнушальнымі лічбамі і радкамі сусветнага рэйтынгу стаіць напружаная праца амаль 20 тысяч чалавек (такі на аб'яднанні вялікі калектыў), якія ўвасабляюць у жыццё самыя амбіцыйныя планы.

Аднак вялікая вытворчасць — гэта непазбежна і экалагічныя праблемы, вырашэнне пытанняў аховы навакольнага асяроддзя. На горназдабываючых прадпрыемствах такія праблемы заўсёды павінны быць пад жорсткім кантролем. Адпаведная задача на вытворчым аб'яднанні «Беларускалій» выконваецца на высокім узроўні, што ўдалося пабачыць на ўласныя вочы. Актуальнасць праблемы вызначае сур'ёзнае стаўленне да яе належнага вырашэння, вопыт буйнейшага айчыннага прадпрыемства ў гэтым плане можна лічыць пераканальным. Прынамсі, падчас камандзіроўкі ў Салігорск нам удалося менавіта так...

Горад у кветках і сучасная горназдабываючая тэхніка — вось характэрныя рысы сённяшняга Салігорска (на здымку — горны майстар Вадзім АЛЯКСЕЕЎ у шахце, дзе на 650-метровай глыбіні камбайны здабываюць калійную соль).

Трубаправоды са шклопластыку — сучаснае і высокаэфектыўнае абсталяванне.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

ЗВАННЕ НАРОДНАГА МАСТАКА АНІКЕЙЧЫКУ БЫЛО ПРЫСВОЕНА... «НАСУПЕРАК ПРАВІЛАЎ»

Анатоль АНІКЕЙЧЫК з архітэктарам Леанідам ЛЕВІНЫМ у майстэрні.

Мемарыяльны комплекс «Прарыў» (каля г.п. Ушачы) і «Праклён фашызму» (на месцы спаленай вёскі Шунеўка Докшыцкага раёна), помнік Мікалаю Гастэлу і яго экіпажу каля г.п. Радашковічы, мемарыяльныя знакі ў Цэнтральным скверы каля Купалаўскага тэатра на месцы пакарання смерцю членаў Мінскага падполля і на плошчы Незалежнасці на месцы гібелі галоўнага рэдактара падпольнай газеты «Звязда» Уладзіміра Амельянюка, фантаны «Юнацтва» і «Купалінкі», надмагіллі С. Прытыцкага, М. Лынькова, П. Машэрава...

Вялікае месца ў творчасці Анатоля Анікейчыка належыць вобразу Янкі Купалы: надмагілле паэта на Вайсковых могілках (з А. Заспіцкім), помнік Купалу ў Мінску (з Л. Гумілеўскім і А. Заспіцкім), у Ляўках, іншыя работы. А яшчэ — дзесяткі партрэтаў і тэматычных кампазіцый.

Як шмат паспеў зрабіць гэты таленавіты чалавек за 56 гадоў, адмераных яму лёсам...

Напярэдадні 75-годдзя Анатоля Анікейчыка мы гутарылі з яго ўдавой Ларысай Ісакаўнай.

— Толькі што Беларусь адзначыла 125-годдзе Янкі Купалы. Менавіта купалаўская тэма — адна са знакавых у творчасці Анатоля Анікейчыка...

— Помнік на магіле на Вайсковых могілках — там адлюстраваны адзін стан паэта. Купала ў скверы — зусім іншы, урачысты. Купала ў Ляўках (гэта самая любімая мая работа): смутак, трывога за Беларусь напярэдадні вайны... Купала ў Араўпарку ў Нью-Йорку: туга па Радзіме нават у вачах прачытваецца...

У кожнай рабоце — зусім іншы стан паэта, нібыта жыццё Купалы ўвасобілася ў работах Анатоля Анікейчыка. Ён любіў і цудоўна ведаў творчасць Янкі Купалы. Яго работы — гэта не проста пошук знешняга падабенства, а спроба перадаць унутраны стан паэта ў розныя перыяды жыцця.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

Твае правы

«ДАПЛАТЫ» ЗАСТАЮЦЦА БЕЗ ЗМЯНЕННЯЎ

Як вядома, адной з асаблівасцяў беларускага заканадаўства з'яўляецца магчымасць прадастаўлення павышэнняў і надбавак да пенсій асобным катэгорыям грамадзян. Між тым, як сведчаць звароты ў рэдакцыю, зараз якраз тут і ўзнікаюць шматлікія пытанні. У прыватнасці, хто на самай справе мае права на надбаўкі і павышэнні, што з'яўляецца падставай для іх прызначэння і ці застаюцца яны ў сувязі з прыняццем новага заканадаўства аб ільготах? Аб гэтым і іншым — наша гутарка з начальнікам галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянцінай Вікенцьеўнай КАРАЛЁВАЙ.

КАМУ І КОЛЬКІ?

Пералік катэгорый, якім прадастаўлена права на павышэнні, вызначаны ў Законе «Аб пенсійным забеспячэнні». І тут жа ўказаны канкрэтныя памеры «даплат». Але, як кажуць, аб усім па парадку.

Такім чынам, па-першае, павышэнні ў памеры 500 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту атрымліваюць Герої Беларусі, Савецкага Саюза і Сацыялістычнай Працы, а таксама асобы, што ўзнагароджаны ордэнамі Славы трох ступеняў і ордэнамі Працоўнай Славы зноў-такі трох ступеняў. Па-другое, павышэнне на 400 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту робіцца інвалідам вайны I і II груп, і на 250 працэнтаў — інвалідам вайны III групы. Таксама 250 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту складаюць даплаты былым партызанам, вайскоўцам і супрацоўнікам унутраных спраў, што ў вайну праходзілі службу ў дзеючай арміі або прымалі ўдзел у баявых дзеяннях пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку, вольнанаёмным асобам, што праходзілі службу або працавалі падчас вайны ў складзе дзеючай арміі, асобам, што прымалі ўдзел у размініраванні ў складзе спецыяльных фарміраванняў вызваленых тэрыторый і аб'ектаў на працягу 1943—1945 гадоў.

Павышэнне ў 180 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту прадугледжана бацькам і жонкам, што не ўзялі новы шлюб, вайскоўцаў, супрацоўнікаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных здарэннях, органаў фінансавых расследаванняў, смерць якіх звязана з выкананнем службовых абавязкаў. Далей. «Прыбаўка» ў 100 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту вызначана блакаднікам Ленінграда, вязням фашысцкіх месцаў прымусовага ўтрымання, якія не здзейснілі ў гэты час злачынстваў супраць Радзімы, дзецям-інвалідам з дзяцінства вайскоўцаў, супрацоўнікаў унутраных спраў, МНС і органаў фінансавых расследаванняў, смерць якіх звязана з выкананнем службовых абавязкаў, а таксама бацькам, жонкам, што не ўзялі новы шлюб, і дзецям-інвалідам з дзяцінства памерлых інвалідаў вайны.

Апроч таго, «дадаткова» 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту атрымліваюць інваліды з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі ці знявечання, звязаных з баявымі дзеяннямі падчас Вялікай Айчыннай вайны, асобы, што былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі за самаахвярную працу і бездакорную вайсковую службу падчас вайны ў тыле, грамадзяне, што былі неабгрунтавана рэпрэсаваны і затым рэабілітаваны ў 20—80 гадах мінулага стагоддзя. На такую ж велічыню павялічваецца і пенсія па ўзросту інвалідаў з дзяцінства, інваліднасць якім установлена пажыццёва. І, нарэшце, даплата ў 40 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту здзяйсняецца донарам. Аднак пры дзвюх умовах — дасягненні агульнага пенсійнага ўзросту і наяўнасці ганаровага знака. Гэта знакі «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь», «Ганаровы донар СССР» і «Ганаровы донар Таварыства Чырвонага Крыжа БССР».

— Пры гэтым варта мець на ўвазе, што ў выпадку, калі права на павышэнне ёсць адразу па некалькіх падставах, прызначаецца толькі адно з іх, — заўважае Валянціна Каралёва. — У дадзеным выпадку выбар залежыць ад самога чалавека, аднак, зразумела, што такі выбар заўсёды робіцца на карысць большага памеру.

Што ж да надбавак, то іх у нас усяго некалькі. Так, надбаўка ў памеры 100 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту ўстанаўліваецца да пенсій інвалідам I групы. А надбаўка ў 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту выплачваецца асобам, што дасягнулі 80-гадовага ўзросту, а таксама адзінокім пенсіянерам ці інвалідам II групы, якія па заключэнню медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі маюць патрэбу ў пастаянным пабочным доглядзе.

ЗВАЖАЙ НА БПМ

Няцяжка заўважыць, што ўсе пералічаныя «даплаты» залежаць ад памеру мінімальнай пенсіі па ўзросту. А ў сваю чаргу апошняя складае 25 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму, які, як правіла, змяняецца 4 разы на працягу года — з 1 лютага, 1 мая, 1 жніўня і 1 лістапада.

Да слова, на сёння бюджэт пражыткавага мінімуму вызначаны ў 179 100, а, адпаведна, 100 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту — у 44 775 рублёў.

ГАЛОЎНАЕ ПАЦВЕРДЗІЦЬ СТАТУС

Права на надбаўкі і павышэнні маюць усе ўзгаданыя катэгорыі грамадзян незалежна ад таго, працягваюць яны працаваць або не. Аднак галоўная ўмова атрымання даплат — дакументальна пацвердзіць пэўны статус.

— Нялішне яшчэ раз заўважыць, што для пачатку выплаты павышэння ці надбаўкі неабходна самастойна прадставіць патрэбныя дакументы — да прыкладу, пасведчанне інваліда, донара, удзельніка вайны ці медыцынскае заключэнне аб патрэбе ў доглядзе, — тлумачыць Валянціна Каралёва. — Па сутнасці «аўтаматычна» прызначаецца толькі надбаўка на догляд пенсіянеру, які дасягнуў 80-гадовага ўзросту, — інфармацыю аб гэтым нашы спецыялісты бяруць самі з пенсійнай справы.

Варта таксама нагадаць, што павышэнні і надбаўкі выплачваюцца разам з «агульнай» пенсіяй. Інакш кажучы, пенсія атрымліваецца як бы з дзвюх частак. Прычым ці робіцца прызначэнне часткі «дадатковай», лепш за ўсё пацікавіцца ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароны свайго раёна.

«ІЛЬГОТНЫ» ЗАКОН — НЕ АБ ПЕНСІЯХ

І ўсё ж ці не найбольш «папулярнае» на сёння пытанне — што будзе з «пенсійнымі» павышэннямі і надбаўкамі пасля прыняцця новага Закона «Аб упарадкаванні сацыяльных ільгот і гарантый»?

— Увогуле ў любой страхавой сістэме пенсія павінна залежаць толькі ад дзвюх акалічнасцяў — стажу і заробку, з якога рабілася выплата ўзносаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання, — кажа Валянціна Каралёва. — Бо не сакрэт, што пэўныя «прывілеі», у тым ліку павышэнні і надбаўкі, сёння аплачваюцца з агульнага фонду, што ў сваю чаргу шмат у чым стрымлівае рост пенсій у цэлым. Магчыма, тыя ж 100 працэнтаў мінімальнай пенсіі па ўзросту — няшмат. Але калі памножыць яе памер, скажам, на 54 тысячы былых вязняў, то атрымаецца ўжо значная сума — звыш 2,4 млрд рублёў у месяц. І гэта, заўважым, датычыцца толькі адной з катэгорый.

Разам з тым нельга не адзначыць: пытанне аб скасаванні надбавак і павышэнняў да пенсій ніколі не ўзнімалася, і, зразумела, яно не разглядалася «ў звязцы» з новым заканадаўствам па льготах. Таму, падкрэслівае Валянціна Каралёва, ніякіх падстаў для хвалявання тут няма — правы на надбаўкі і павышэнні застаюцца без змянення.

Сяргей ГРЫБ.

Вакансіі «пайшлі» ў рэгіёны

З пачатку года колькасць беспрацоўных у малых гарадах Беларусі зменшылася на 7,7 працэнта — аб гэтым паведаміла прэс-сакратар Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна Трафіменка. — Прычым зніжэнне ўзроўню беспрацоўя адзначана ў 26 з 29 найбольш «праблемных» у плане пошуку вакансій населеных пунктаў, якія ўвайшлі ў дзяржаўную, а таксама ў 11 з 13 населеных пунктаў, якія ўключаны ў абласныя праграмы занятасці насельніцтва.

Як адзначыла Галіна Трафіменка, паляпшэнне сітуацыі на рынку працы перш-наперш тлумачыцца павелічэннем колькасці вакансій. З 21 тысячы працоўных месцаў, якія было запланавана арганізаваць у малых гарадах сёлета, толькі за студзень—май створана больш за 10 тысяч. У прыватнасці, заўважыла Галіна Трафіменка, дадатковыя месцы ўзніклі ў выніку пашырэння вытворчасці па перапрацоўцы драўніны ў Краснаполлі, адкрыццю вытворчасцяў па пашыву жаночай бялізны ў Воранаве, прадпрыемства па вырабу акон і дзвярэй у Скідалі, арганізацыі зборкі садовых трактароў і вытворчасці малакорпусных плугоў для энерганасычанай сельгастэхнікі ў Смаргоні.

Між тым, паводле звестак міністэрства, нягледзячы на павелічэнне колькасці зваротаў (за студзень—чэрвень па дапамогу ў працаўладкаванні прыйшлі 158,8 тыс. чалавек), у цэлым па краіне адзначана зніжэнне ўзроўню беспрацоўя — зараз ён складае 1 працэнт. Пры гэтым найбольш высокі ўзровень быў у Віцебскай і Брэсцкай абласцях (па 1,4 працэнта), а найменшы (0,4 працэнта) — у сталіцы. Дарэчы, усяго ў пачатку ліпеня ў Беларусі было зарэгістравана 46,3 тыс. беспрацоўных і адначасова службы занятасці мелі звесткі аб наяўнасці 57 тыс. вакансій.

Сяргей ГРЫБ.

В производстве суда Советского района г. Минска имеется на рассмотрении дело по заявлению УП «ЖРЭО Советского района г. Минска» о признании безвестно отсутствующим **СКРАБАТУНА Степана Дмитриевича**, 1943 года рождения, проживающего по адресу: г. Минск, ул. Богдановича, 102—46 в г. Минске. Всем, кто знает место нахождения Скрабатуна С.Д., видел его, просьба представить в суд в течение двух месяцев соответствующую информацию.

Адказнаму работніку Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі прад'яўлена абвінавачанне ў махлярстве

Аб гэтым паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС рэспублікі.

Уладзімір Холад быў затрыманы праваахоўнымі органамі 30 чэрвеня. Сёння яму следчымі галоўнага ўпраўлення папярэдняга расследавання МУС прад'яўлена абвінавачанне ў махлярстве ў асабліва буйным памеры і падбухторванні да дачы хабару ў буйным памеры. Адносна абвінавачанага выбрана мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту. Абставіны справы не раскрываюцца, паколькі яны з'яўляюцца тайнай следства, адзначылі ў МУС.

У спадчыну ад Шамякіна

Аддзел рэкламы «Звязды». Тэлефоны звоняць.

— Добры дзень! Мы прыйшлі забраць прыз, выйгралі ў вашай латарэі...

— Прывітанне. Скажыце, калі ласка, ваша прозвішча, я вам пропуск закажу.

— Махонь. Махонь Сяргей Уладзіміравіч. Я з сынам.

— Падыходзьце да бюро прапускоў, потым падымайцеся ў 530 кабінет, мы вас будзем чакаць.

Вось і яны... Адзначаю пра сябе, што нашы падпісчыкі, як звычайна, людзі прыгожыя, светлыя. І сын на бацьку падобны вельмі. Пакуль бухгалтэрыя афармляе дакументы, прапаную прысесці пачакаць, пагутарыць.

— Чым займаецеся, Сяргей Уладзіміравіч, дзе працуеце?

— У БДУ, выкладаю.

— Ці даўно «Звязду» выпісваеце? Што ў нас чытаеце?

Аддзел рэкламы «Звязды». Тэлефоны звоняць.

— Добры дзень! Мы прыйшлі забраць прыз, выйгралі ў вашай латарэі...

— Прывітанне. Скажыце, калі ласка, ваша прозвішча, я вам пропуск закажу.

— Махонь. Махонь Сяргей Уладзіміравіч. Я з сынам.

— Падыходзьце да бюро прапускоў, потым падымайцеся ў 530 кабінет, мы вас будзем чакаць.

Вось і яны... Адзначаю пра сябе, што нашы падпісчыкі, як звычайна, людзі прыгожыя, светлыя. І сын на бацьку падобны вельмі. Пакуль бухгалтэрыя афармляе дакументы, прапаную прысесці пачакаць, пагутарыць.

— Чым займаецеся, Сяргей Уладзіміравіч, дзе працуеце?

— У БДУ, выкладаю.

— Ці даўно «Звязду» выпісваеце? Што ў нас чытаеце?

— Ды ўжо ў наступным годзе будзе 60 гадоў, як «Звязда» ў нашай сям'і. З 48-га года, як бацька жонкі пераехаў у Мінск — заўсёды выпісваў, супрацоўнічаў, сябраваў. Яго амаль 3 гады няма з намі, а мы з жонкай выпісваць і чытаць не перасталі, гэта ўжо сямейная традыцыя. Вось і сын, Іван, у гонар дзеда назвалі, падпісчыкам будзе, абавязкова.

— А як вашага цесця прозвішча? Актыўных падпісчыкаў у газеце доўга помняць.

— Шамякін... Іван.

— Шамякін? Народны пісьменнік?

— Ён... Усё жыццё Іван Пятровіч «Звязду» вельмі паважаў, з журналістамі сустракаўся часта, апавяданні свае на конкурсы дасылаў, справу распачаў па наданню праспекту імя газеты. Неабыякавы быў, шчыры прыхільнік. «Звяздзе», асабліва напярэдадні юбілею, хочацца больш такіх чытачоў пажадаць. А яшчэ супрацоўнікаў — прафесіяналаў сваёй справы, каб беларускае слова неслі праз цікавую карысную інфармацыю, бо сёння «Звязда» — гэта не проста газета, гэта штодзённая сустрэча з роднай мовай, з нашай культурай, спадчынай.

Сям'я Махонь, дарэчы, выйграла звяздоўскі юбілейны гадзіннік. Хочацца спадзявацца, што ён будзе адлічваць толькі шчаслівыя хвіліны, гадзіны і дні...

Таццяна ЛЯЎКОВІЧ.
Фота Аляксандра НІКАНАВА.

ЧАЛАВЕК ГОДА — ЧАЛАВЕК «ДЕЛА»

Гэтымі днямі рэдакцыя часопіса «Дело (Восток+Запад)» правяла фінал чарговай штогадовай акцыі па вызначэнню і ўшанаванню «Человека Дела».

Традыцыйна па выніках конкурсу ў самых разнастайных намінацыях вызначаюцца кіраўнікі айчынных і замежных прадпрыемстваў, якія найбольш дынамічна працуюць на беларускім рынку. І ў гэты раз узнагародамі часопіса адзначыліся 12 самых паспяховых топ-менеджараў і ўладальнікаў бізнэсу.

І так, лаўрэатамі конкурсу «Человек Дела-2007» сталі:

1) у намінацыі «За паспяховае прымяненне новых тэхналогій і метадаў кіравання» — генеральны дырэктар РУП «Беларускі металургічны завод» Мікалай АНДРЫЯНАЎ.

Сёння наўрад ці каму трэба нагадваць, што Беларускі металургічны завод — гэта адзін з лакаматываў нацыянальнай эканомікі. Толькі за 6 месяцаў 2007 года прадпрыемства адправіла на экспарт прадукцыі на суму 75 мільёнаў долараў ЗША, што на 142 працэнты больш за адпаведны перыяд мінулага года. Больш за тое, у мінулым годзе БМЗ быў прызнаны самым эфектыўным прадпрыемствам у металургічнай галіне СНД.

Безумоўна, што самым вялікім прарывам, які дазволіў Беларускаму металургічнаму заводу выйсці на новыя рынкі, быў запуск унікальнага трубапракатнага комплексу — фактычна новага завода, на якім будзе выпускацца прынцыпова новая прадукцыя — бясшоўныя гарачакатаныя трубы. Новая вытворчасць выйдзе на поўную магутнасць ужо праз паўтара года, а за 5 гадоў — поўнасцю акупіцца.

Іншыя намінацыі і іх уладальнікі:

2) Сяргей РУМАС, старшыня праўлення ААТ «Белаграпрамбанк» — «За істотны ўклад у развіццё фінансавага рынку краіны».

3) Юрый ТУМАХА, генеральны дырэктар групы прадпрыемстваў «Дарэлектрамаш» — «За стабільную і эфектыўную работу на айчынным рынку».

4) Міхаіл ЛІТВІН, генеральны дырэктар ААТ «Мазырсоль» — «За павышэнне прэстыжу маркі «Зролена ў Беларусі».

5) Аляксандр МІНЬКО, дырэктар ПУП «МАВ» — «За стварэнне высокатэхналагічнага прадпрыемства, што падае прыклад інавацыйнага шляху развіцця».

6) Павел КРУПНОЎ, генеральны дырэктар ААТ «Прамаралізінг» — «За актыўнае садзейнічанне развіццю аграрнага сектара Беларусі».

7) Барыс МЕДНІК, генеральны дырэктар ААСТ «Бі энд Бі іншурэнс» — «За бездакорныя паводзіны ў няпростых рынкавых сітуацыях».

8) Уладзімір ЧАРНУШЭВІЧ, дырэктар Агенцтва нерухомасці «Загарадны дом» — «За самую арыгінальную бізнэс-ідэю, якую ўвасобіў айчынны прадпрымальнік».

9) Уладзімір РЫБАЛАЎЦОЎ, кіраўнік прадстаўніцтва кампаніі Robert Bosch Gmbh у Беларусі — «За падтрымку высокага стандарту замежнай маркі на айчынным рынку».

10) Уладзімір ВАСІЛЕЎСКІ, старшыня Савета дырэктараў групы кампаній «Юнітэр» — «За высокую якасць бізнэс-паслуг».

11) Аляксандр ЯНОЎСКІ, генеральны дырэктар ААТ «Амкадор» — «За важкі ўклад у знешнеэканамічныя сувязі Рэспублікі Беларусь».

12) Мікалай ДУДКО, генеральны дырэктар ААТ «Піўзавод «Аліварыя» — «За актыўнае прыцягненне і эфектыўнае выкарыстанне замежных інвестыцый».

Конкурс «Человек года-2007» праводзіўся ў 12-ы раз. Арганізатарамі акцыі сталі галоўны рэдактар часопіса «Дело (Восток+Запад)» Віктар ЖУК і Пётр НІКІЦЕНКА, які з'яўляецца старшынёй грамадскага рэдакцыйнага савета часопіса.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

4 тысячы пустых дамоў будзе прададзена з-пад малатка?

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле дзяржаўнага кантролю за выкарыстаннем і аховай зямель і геадэзічнага нагляду Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі, па стану на 1 ліпеня ў краіне сёлета спецыяльнымі камісіямі было абследавана 22 535 населеных пунктаў. Пасля праведзенай маштабнай работы гаспадарамі пустога жылля было накіравана ў сельвыканкамы 45 446 заяў аб намеры выкарыстоўваць жылыя дамы для пастаяннага або сезоннага пражывання.

У вызначаных населеных пунктах спецыялісты абследавалі 66 278 дамоў, па якіх у мясцовых уладаў былі пытанні. У выніку абследавання 17 630 пабудоў атрымалі заключэнне аб тым, што ў гэтых дамах ніхто не жыве. Аднак з гэтай колькасці аб'ектаў нерухомасці толькі 4108 дамоў трапілі ў спецыяльны рэгістр пустых дамоў. Справа ў тым, што вялікая колькасць гаспадароў звярталася ў выканкамы пасля публікацыі ў мясцовай газеце даных аб магчымым уключэнні ў рэгістр іх дамоў як пустуючых.

Выканкамы разгледзелі толькі 7580 заключэнняў спецыяльных камісій. Акрамя таго, зараз у мясцовых сродках масавай інфармацыі размешчаны паведамленні аб 5612 дамах, якія могуць трапіць у рэгістр пустых. Пасля канчатковага ўключэння пустых дамоў у спецыяльны рэгістр мясцовыя ўлады павінны будуць наладзіць продаж гэтых аб'ектаў нерухомасці, у тым ліку і праз механізм аўкцыёнаў. Найбольш актыўна барацьбу з пустым жыллём у вёсцы наладзілі ў заходнім рэгіёне краіны. У Брэсцкай вобласці было складзена 7569 заключэнняў аб пустых дамах, у Магілёўскай — 3394, у Мінскай — 2874.

Сёння ў краіне за паўгоддзе знесена 7963 старыя дамы. Больш за палову з гэтай колькасці было знесена ў Віцебскай вобласці — 4115 дамоў. Увогуле, сёння ў краіне налічваецца 41 260 старых дамоў...

Сяргей КУРКАЧ.

Простыя рэчы

Кошык

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Якая простая рэч — кошык. І зноў жа незабыўны ўспамін дзяцінства: на гарышчы бацькоўскага дома вісіць ладны, у абхват рук кошык, зверху накрыты таксама плеценай з лазы накрыўкай. Падымеш гэту накрыўку — а адтуль пах непаўторны, зманлівы. Там, у кашы, ляжаць каўбасы, пальцам пханыя. Яны і ў летні час тут не псуюцца, бо ветрык прадувае гарышча, а заадно і кошык са зманлівым наедкам. Туды не залезе ні кот, ні пацук. Туды толькі чалавек можа запусціць сваю руку, падняўшы даволі шчыльную накрыўку. А ў кашы — раскоша. Асабліва летам. Каўбасы выпусцілі лішні лой (таму добра такі засохлыя), каўбасы засохлі да таго стану, калі адломваюцца з асаблівым, вельмі спецыфічным пошчакам. Трэсь — і ў руках у цябе кавалак, якія спажываеш ужо не на гарышчы — каб дарослыя не заспелі — а дзе-небудзь у закутку, разам з сябрукамі. Канешне, паласавацца можна адзін-два разы, а потым бацькі пабачаць страту. Маці асабліва вядзе ўлік гэтаму наедку, бо яго ўсё менее і менее. Гэта зімою, адразу пасля забою кабана, іх нарабляецца шмат і ўліку аніякага. А летам каўбаса прызначаецца найперш касцу ці, калі застанецца — на капанне бульбы, бо там справа таксама нялёгкая, а талаку трэба пакарміць смачна. Але ж ёсць сябрукі, у якіх таксама ёсць гарышчы, а там таксама вісяць кашы, у якіх свая прывабнасць. Не, нешта скрадалі мы ад бацькоў не ад голаду. У часы майго дзяцінства голаду ўжо не было. Проста па сваёй, яшчэ вясковай звычцы нашы бацькі, тагачасныя местачкоўцы, самае смачнае перахоўвалі, зберагалі да святаў калядных, велікодных і нават да партыйных. А нам жа хацелася паласавацца. Вось таму і зазіралі зрэдзь часу ў гэтыя кашы на гарышчах. Пільнуючыся, каб страта была не вельмі прыкметнай.

Седзячы за камп'ютарам над гэтым артыкулам, паклікаў маці і прачытаў ёй напісанае. Яна ўсміхнулася: бачылі тады яны нашы свавольствы, проста дазвалялі нам іх, дзецям — лепшае. Дарэчы, маці сказала, што той кош з накрыўкай нават сёння на гарышчы над хатай. Не паленаваўся — палез. Сапраўды так — ён, той самы. Праўда, паху ранейшай каўбасы ў ім зусім не захавалася. Ды і каўбаса гэтая, пальцам пханая, у нашых хатах калі і вырабляецца, то толькі з купленага на кірмашы мяса, а гэта ўжо не тое.

Шмат пазней, займаючыся на філалагічным факультэце ўніверсітэта, я пазнаў, што такі кош, для захоўвання каўбасы, вяндліны, называецца па-беларуску «сажам». Я люблю карыстацца слоўнікамі. Старымі і сучаснымі. Яны даюць вельмі неблагі матэрыял для маіх роспавядаў пра простыя рэчы нашага мінулага ды і сучаснага жыцця. Люблю паўспамінаць і выказванні нашых пісьменнікаў пра гэтыя самыя простыя рэчы. Прызнацца, пра кош у іх нічога не ўспомніў. Толькі Колас... Так, у яго нешта было пра кош баравікоў. Здаецца, у «Новай зямлі». Але дапытлівага чытача я накіраваў да гэтай паэмы, якая сталася, нягледзячы на ўсялякія забароны і перашкоды 20—30 гадоў мінулага стагоддзя, энцыклапедыяй беларускага жыцця пачатку XX стагоддзя, не губляе сваёй класічнай непаўторнасці і цяпер. А ўсётакі знайшоў! У Аркадзя Смоліча, у яго «Геаграфіі Беларусі» ад 1922 года змешчаны нават здымак кашыкара, чалавека, які вырабляе кошык, пляце яго з лазы. Увогуле ж кошыкі выраблялі і з сасновай ці дубовай дранкі, з каранёў хваёвых дрэў, з ліпавай ці бярозавай кары. І назваў у каша рознага прызначэння, розных памераў, нават розных рэгіёнаў Беларусі вельмі шмат — кораб, шаяк, саламянік, вярэнка, кашэль. У кошыку насілі есці ў поле бацькам, зразумела, насілі дзеці. І таму было прыстасаванне, каб такі кошык закінуць за спіну. Былі і спецыяльныя кашы, якія ўстанаўліваліся на вазы для перавозкі пэўных грузаў, напрыклад, збожжа. Маладыя людзі ўжо ці ведаюць, але нашаму пакаленню помніцца, што кашом называлі ды і цяпер называюць кораб, які ўстанаўліваецца над млынам для засыпання ў яго зерня.

Пішу пра звычайную рэч — кош, а нешта ў памяці падказвае, такая наша памяць: «кош» — нешта звязанае і з казацтвам. І сапраўды так. У запарожскіх казакаў, у XVII—XVIII стагоддзях так называўся іх лагер знаходжання, нават само кіраванне гэтымі казакамі называлася «кошам». Сярод тых казакоў было нямала беглых халопаў і нават шляхціцаў з Беларусі. Таму і ў мове казакоў шмат беларусізмаў, на што звяртаў увагу шмат гадоў таму, чытаючы, напрыклад, «Ціхі Дон». А што такое кош? Нешта няпэўнае, змешанае, але аб'яднанае пэўнымі абручамі, з'яднанае агульнай ідэяй. І ў азіяцкай мове ёсць разуменне «каша». Толькі гэта архітэктурнае, таксама замкнутае, абмежаванае.

Але асноўныя ўспаміны, звязаныя з кашом, для мяне больш празаічныя. Для нас, местачковых хлапчукоў, кош быў найперш прыладай працы. У кашы мы збіралі і бульбу, і буракі, і іншую гародніну. Кош выгадны тым, што ў адрозненне ад вядра яго трэба страсянуць, і — выкінуць лішнюю зямлю. Са школьнага дзяцінства помніцца, што калі паклікалі нас у калгасы на сельгасработы, маці заўсёды давала з сабою не вядро, а менавіта кош. Гэта было ашчадней не толькі для тваёй працы — менш зямлі пацягаеш, але і для самой прадукцыі — не так б'ецца, чысцейшай кладзецца ў кузавы трактароў.

Так складваецца маё жыццё, што і ў свае, за пяцьдзесят, ад ранняй вясны да позняй восені маю немалы клопат на зямлі. І вось бульбачку, буракі ці моркву капаю толькі з кашом. Асабліва ён незаменны, калі зямля пры вільгаці. А патрасеш тую ж бульбачку ў кошыку — яна і пачысцее, менш трэба сушыць.

Сёння вельмі часта сустракаюцца кашы сплеценыя з дроту. З аднаго боку, гэта выгадней. Іх і вырабляць хутчэй, і больш трывалыя яны. Але затое цяжкавата, па-першае, а па-другое — не хочацца класці на металічную сетку той жа сарваны ўвосень яблык, здаецца што, пабываўшы ў старасвецкім, лазовым кашы, ён будзе і захоўвацца лепш.

А схадзіць у грыбы? Ну, не з вядром жа ісці на гэтае ціхае і прыемнае паляванне. Канешне, патрэбен ладны кошычак. Ён і лёгкі для хады па лесе, і грыбы ў ім не труцца. Магчыма, гэта недзе мільгала і ў літаратуры, але ўсё-такі, мусіць, з народнага. Бо помню, бабуля, вялікая была грыбніца, на пытанне суседкі, што ж падабрала яна ў лесе сёння, адказвала:

— А ніштавата, суседачка, кош белых, кош шэрых.

Белымі, зразумела, называла яна баравічкі, яны ішлі на засушку, а то і на продаж, а вось астатнія грыбы спажываліся адразу — марынадаў ці закатак тады не існавала. І лічыліся яны шэрымі.

Шукаючы нейкія старадаўнія звесткі пра кошык, натрапіў і на слова «каліта», у беларускай мове гэтай рэчы адпавядала яшчэ вызначэнне «шабета». Гэта своеасаблівы, невялікі кошычак, які прывешваўся да пояса селяніна. У ім ён захоўваў крэсіва, тытунь, сцізорык, люльку, медзякі і іншую дробязь. Але гэта было характэрна для поўдня Беларусі, асабліва Палесся. А помніце, вывучаючы некалі гісторыю СССР, усе мы чыталі пра маскоўскага яшчэ не цара, а вялікага князя Івана Каліту, на самай справе быў ён Іванам I на маскоўскім пасадзе. Ды за прыжымістасць, уменне напоўніць княскую казну грашыма і надалі яму такое прозвішча.

А ці вырабляюць кошыкі цяпер? Вырабляюць. Некалькі гадоў таму дачка, якая тады працавала ў адной з гарадскіх крам, прынесла нам кошычак, сплецены з лазы. Зразумела, ён не для бульбы ці іншай агародніны, лазовыя галіны пераплецены так густа, што і шчылінак практычна няма. Ды і сам выгляд яго, падзяленне на дзве часткі, не зусім тоўстая ручка — гавораць не аб гаспадарчым прызначэнні.

Ведаеце, і ён мае ў нашай глыбінцы сваё функцыянальнае значэнне. Для збірання грыбоў малаваты. А вось патрэбна вам тэрмінова ў краму, хлеба, напрыклад, да абеду не аказалася, смятаны ці яшчэ чаго. Садзішся на ровар, каб хутчэй. Вось звычайны пакет тут нязручны, можа закруціць у кола. А ў кошычку ўсё будзе цэлым і самому кіраваць роварам лепш.

Так што і надалей няхай служыць нам простая рэч — кошык.

Алесь КАСЦЕНЬ.
Віцебская вобласць.

Дэпутаты падрыхтуюць да лістапада законапраект аб прадастаўленні іншаземцам статусу бежанца

— Адным словам, — канстатаваў старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Валерый Сяліцкі пры падвядзенні вынікаў выязнога пасяджэння прэзідыума, — у раёне рэзерваў для рэалізацыі Указа Прэзідэнта краіны яшчэ многа. Мы разумеем, што праблемай яго з'яўляецца падбор кадраў, лідараў, якія б вялі за сабой людзей і на ўстаноўку агароджаў у вёсках, і будаўніцтва спартыўных пляцовак і г.д. Чэргаў на пасады старшыняў сельсаветаў у раёне няма і не будзе, як недастаткова ў іх і фінансавых магчымасцяў. Але Указ адкрыў для іх новыя гарызонты работы ў многіх напрамках, і гэта неабходна выкарыстаць у поўнай меры.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:

САВЕТ РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

ПАЛАТА ПРАДСТАЎНІКОЎ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ,

УСТАНОВА «РЭДАКЦЫЯ ГАЗЕТЫ «ЗВЯЗДА»

ГРАМАДСКІ САВЕТ:

МАЛАФЕЕЎ А. А., старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцоваму самакіраванню;

СЯЛІЦКІ В. С., старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Валерый Сяліцкі пры падвядзенні вынікаў выязнога пасяджэння прэзідыума, — у раёне рэзерваў для рэалізацыі Указа Прэзідэнта краіны яшчэ многа. Мы разумеем, што праблемай яго з'яўляецца падбор кадраў, лідараў, якія б вялі за сабой людзей і на ўстаноўку агароджаў у вёсках, і будаўніцтва спартыўных пляцовак і г.д. Чэргаў на пасады старшыняў сельсаветаў у раёне няма і не будзе, як недастаткова ў іх і фінансавых магчымасцяў. Але Указ адкрыў для іх новыя гарызонты работы ў многіх напрамках, і гэта неабходна выкарыстаць у поўнай меры.

САСОНКА М. П., старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўнаму будаўніцтву, мясцоваму самакіраванню і рэгламенту;

СІВАКОЎ В. А., старшыня Аршанскага гарадскога Савета дэпутатаў;

ЯРКОВІЧ В. І., старшыня Круглянскага сельскага Савета Магілёўскай вобласці.

АДКАЗНАЯ ЗА ВЫПУСК: Наталля КАРПЕНКА.

Кантактны тэлефон 292-21-03.

Краіна здароўя

Выпуск № 17 (30)

Чырвонаму Крыжу чырванець не даводзіцца. За сваю дзейнасць

Міжнародная федэрацыя Таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца пачала ажыццяўляць чарнобыльскую Праграму гуманітарнай дапамогі і рэабілітацыі (CHARP) у пачатку 1990 года ў адносінах да групы людзей высокай рызыкі (дзецям), што пражывалі на забруджанай тэрыторыі. Сёння гэты міжнародны праект дзейнічае ў шасці абласцях нашай краіны, Расіі і Украіны — Гомельскай, Магілёўскай, Брэсцкай, Бранскай, Жытомірскай і Ровенскай. Аб гэтым і ішла размова на пасяджэнні Міждзяржаўнага Чарнобыльскага Каардынацыйнага Камітэта па чарнобыльскай праграме, якое гэтымі днямі адбылося ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры радыяцыйнай медыцыны і экалогіі чалавека (г. Гомель. Як адзначылі каардынатар чарнобыльскай праграмы ад Міжнароднай праграмы Федэрацыі Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца Мікалай Нагорны і генеральны сакратар Таварыства Чырвонага Крыжа Рэспублікі Беларусь Віктар Калбанаў, ёдны ўдар атрымала ў той ці іншай ступені ўсё насельніцтва нашай краіны. Доўгатэрміновыя вынікі Чарнобыля застаюцца няяснымі, і сёння даказаным наступствам яго з'яўляецца такая паталогія, як рак шчытападобнай залозы. Спецыялісты лічаць, што пік яго распаўсюджанасці ў групе тых, хто на момант катастрофы знаходзіўся ва ўзросце да васемнаццаці гадоў, усё яшчэ наперадзе. Не выключана таксама магчымае павелічэнне колькасці іншых паталогій і злаякасных новаўтварэнняў, выкліканай іанізуючай радыяцыяй, бо ўжо зараз у многіх назіраецца перадракавая паталогія, якая нарастае, зафіксаваны рак малочнай залозы, іншыя негатывы. Таму праграма CHARP будзе прадоўжана.

Праўда, апошнім часам цікавасць да яе міжнародных арганізацый зніжаецца ў сувязі з тым, што ў тых ці іншых краінах адбываюцца землятрусы, ураганы, цунамі і г.д., і грашовыя сродкі іх паступаюць туды. Але не трэба забываць: тое, што нарабіў землятрус, можна аднавіць за два—тры гады, а негатыўныя вынікі Чарнобыля расцягваюцца на многія-многія дзесяцігоддзі. І трэба тут сказаць, што ў цэлым тэндэнцыя па фінансаванню праграмы CHARP на працягу апошніх некалькіх гадоў не была пазітыўнай. Так, у 2001—2002 гадах бюджэт так званага закліку дактароў папоўніўся толькі на 30—32 працэнты. У той жа час доўгатэрміновыя дзеянні, неабходныя для пераадолення вынікаў катастрофы, патрабуюць, каб праграма мела стабільныя крыніцы фінансавання.

Летась яна атрымала падтрымку ад ірландскага ўрада ў суме 500 тысяч еўра, і гэты грант прызначаны да мая 2009 года, таму Міждзяржаўны Каардынацыйна Камітэт мае намер звярнуцца да шэрагу міжнародных арганізацый, каб яны выступілі ў адносінах да праграмы CHARP у якасці донараў. Тым больш што ў канцы 2008 года Міжнародная федэрацыя Таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца выходзіць з чарнобыльскай праграмы. Значыць на парадак дня паўстане пытанне аб пашырэнні так званага мясцовага ўкладу ў яе, які сёння дасягнуў 20 працэнтаў агульнага аб'ёму дапамогі, паступова ўскладваючы большую адказнасць за чарнобыльскія справы на рэгіянальныя і мясцовыя дзяржаўныя структуры аховы здароўя. Нацыянальныя таварыствы Чырвонага Крыжа Беларусі, Расіі і Украіны не плануюць закрываць праграму пасля 2008 года і будуць працягваць пошук інтэрнацыянальнай падтрымкі і паралельна павялічваць унутраны ўклад у яе, аб чым і падпісана пагадненне паміж імі, дзе ўпор таксама робіцца на ўзмацненне прафілактычнай, дыягнастычнай і лячэбнай дзейнасці пацярпелых рэгіёнаў.

Летась і сёлета чарнобыльская праграма была сканцэнтравана на медыцынскі скрынінг шчытападобнай залозы ў людзей, якія былі ва ўзросце да сарака гадоў у час выбуху на чарнобыльскім рэактары і якія пражываюць на радыяцыйна забруджаных тэрыторыях памянёных вышэй шасці абласцей Расіі, Украіны і Беларусі. У 2006 годзе каля 156 тысяч іх атрымалі дапамогу непасрэдна па ўказанай праграме, прыблізна столькі ж будзе і сёлета.

Пры гэтым скрынінг быў сфакусіраваны на аператыўных раёнах, якія даўно не абследаваліся гэтым метадам або не абследаваліся наогул па шчытападобнай залозе. Працавала шэсць мабільных (перасоўных) дыягнастычных лабараторый, тры з якіх у нашай краіне, і летась былі праверaны ў рамках праграмы 91 086 чалавек. Спецыялісты іх выявілі 36 136 выпадкаў розных адхіленняў (паталогій), і ў 40 працэнтаў абследаваных гэта былі паталогіі шчытападобнай залозы на розных стадыях іх развіцця. 6991 пацыент быў накіраваны з падазрэннем на рак у спецыялізаваныя медыцынскія ўстановы для далейшага абследавання, а ў 212 выпадках ён быў пацверджаны. Для параўнання: у 2005 годзе такіх выпадкаў было 221.

Акрамя раку шчытападобнай залозы, спецыялісты мабільных лабараторый у ходзе скрынінгу выявілі 13 788 выпадкаў вузлавой паталогіі, 11 919 — дыфузнага зоба і 6769 — тырэадзіту, якія, калі не пралычыць гэтых людзей, маглі б перарасці ў рак шчытападобнай залозы. Работнікі лабараторый, персанал Чырвонага Крыжа і валанцёры праводзілі тэрапеўтычны агляд людзей па іх просьбах ці скаргах на стан здароўя, забяспечвалі псіхасацыяльную падтрымку насельніцтву, якое пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы. За сваю дзейнасць, вобразна кажучы, ім не даводзіцца чырванець.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Інфарм-укол

ЛІШАК ТЛУШЧУ СЯБРУЕ З ДЫЯБЕТАМ

Вучоныя Каліфарнійскага ўніверсітэта прыйшлі да высновы, што пазбаўленне ад тлушчу можа пазбавіць і дыябету 2-га тыпу, які, як правіла, узнікае ў людзей у другой палове жыцця.

Аказваецца, лішак тлушчу падаўляе ген, адказны за выпрацоўку гармону інсуліну, які, у сваю чаргу, кантралюе ўзровень цукру (глюкозы) ў крыві. Калі тлушч блакіруе памянёны ген, то ўзровень інсуліну падае. А ўзровень глюкозы ў крыві павышаецца. Высокі ж узровень цукру ў крыві — асноўны сімптом дыябету.

САПРАЎДЫ, НАПУЖАЎ

У недарэчнага жарту — сур'ёзныя наступствы. На бераг Чыжоўскага вадасховішча давялося выехаць выратавальнікам і медыкам. Па тэлефоне «103» пазваніла жанчына і расказала, што яе сябар нырнуў і вось ужо 15 хвілін знаходзіцца пад вадой. Каля паўгадзіны працягваліся пошукі цела. За гэты час жанчыне, якая выклікала «хуткую дапамогу», стала дрэнна, і яе адвезлі ў бальніцу з падазрэннем на гіпертанічны крыз. Як толькі карэта хуткай дапамогі з'ехала, прытворны «тапелец» выбраўся з кустоў і здзіўлена пацікавіўся: «А што, уласна, адбываецца?». Аказалася, ён вырашыў крыху папужаць сяброўку, але нават не думаў, што жарт выкліча такія наступствы.

Кацярына ГУСЕВА, «Мінск-Навіны».

Доктар адкажа

ДЗЯЖУРСТВЫ НА «ГАРАЧАЙ» ЛІНІІ ЎПРАЎЛЕННЯ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ МІНАБЛВЫКАНКАМА (017) 220-20-25

24 ліпеня:

9.00—12.00 — загадчык сектара лячэбна-прафілактычнай дапамогі даросламу насельніцтву, галоўны тэрапеўт Таіса Уладзіміраўна БАРАВАЯ.

14.00—17.00 — галоўны ўрач Мінскай абласной клінічнай бальніцы Ігар Мікалаевіч ЛАДУЦЬКА

31 ліпеня:

9.00—12.00 — галоўны ўрач абласнога радзільнага дома Пётр Леанідавіч МАСЬКО.

14.00—17.00 — галоўны ўрач Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Людміла Аляксандраўна КАЛАСКОВА.

7 жніўня:

9.00—12.00 — галоўны акушэр-гінеколаг Марына Аляксандраўна ШКРОБ.

14.00—17.00 — галоўны ўрач Мінскай абласной стаматалагічнай паліклінікі Алег Анатольевіч ЖЫВАЕЎ.

14 жніўня

9.00—12.00 — галоўны ўрач МРЭК Мінскай вобласці — Юлія Анатольеўна АЎСЯНІК.

14.00—17.00 — галоўны ўрач Мінскага абласнога наркалагічнага дыспансэра Людміла Анатольеўна АНДРЭЕВА.

У акцыі «Тваё сэрца б'ецца не толькі для цябе» ўзялі ўдзел 25,5 тыс. чалавек

У Мінску ў агульнагарадской медыка-асветніцкай акцыі «Тваё сэрца б'ецца не толькі для цябе» ўдзельнічалі 25,5 тыс. чалавек. Аб гэтым паведаміў старшыня камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Дзмітрый Піневіч на аператыўнай нарадзе ў мэрыі.

Акцыя праходзіла 28—29 чэрвеня з мэтай павышэння інфармаванасці насельніцтва аб небяспецы артэрыяльнай гіпертэнзіі, а таксама своечасовага выяўлення захворвання. У 60 месцах (дзяржаўных аптэках, гандлёвых цэнтрах, магазінах, на станцыях метро) былі развернуты пункты па вымярэнню ціску. «З агульнай колькасці тых, хто звярнуўся да медыкаў, 70 працэнтаў складалі жанчыны і 30 працэнтаў — мужчыны. Гэта гаворыць аб тым, што прадстаўніцы слабага полу надаюць больш увагі свайму здароўю», — сказаў спецыяліст. Станоўчым момантам ён назваў той факт, што больш за 30 працэнтаў удзельнікаў акцыі — маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў, што сведчыць аб увазе моладзі да стану свайго здароўя. Разам з тым Дзмітрый Піневіч канстатаваў, што ў паловы тых, хто звярнуўся да медыкаў, быў зарэгістраваны павышаны артэрыяльны ціск. Пры гэтым у 1,3 тыс. — упершыню. Накіраванні ў паліклінікі атрымалі 2,7 тыс. чалавек, 250 — на абследаванне ў гарадскі кардыялагічны дыспансэр. «Трывожыць той факт, што на месцы медыцынская дапамога была аказана 1,8 тыс. (16 %) мінчан. У асноўным гэтыя грамадзяне ведалі аб існуючай гіпертэнзіі, мелі назначэнні на яе лячэнне, але не выконвалі іх». Атрыманыя ў ходзе акцыі даныя будуць прапанаваны для разгляду гарадскога савета па дэмаграфічнай бяспецы.

Кар. БЕЛТА.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

Вучань СШ № 2 г. Ашмяны абсалютны чэмпіён Беларусі, сярэбраны прызёр чэмпіянату свету ў сілавым трохбор'і, майстар спорту Вадзім БЕЗУКОВІЧ на трэніроўцы ў комплекснай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе.

Прамая лінія

КАБ НЕ «СЦІСКАЛА» НІ СПІНУ, НІ ГАЛАВУ



На пытанні чытачоў адказвае загадчыца неўралагічнага аддзела Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі, галоўны пазаштатны неўролаг Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, кандыдат медыцынскіх навук Ганна АСТАПЕНКА.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 6, 7 ліпеня)

☎ — Мяне завуць Тамара Аляксееўна. Званю з Чэрвеньскага раёна. Майму старэйшаму сыну — 27 гадоў. Нядаўна яго забралі на «хуткай» у Мінск, у 5-ю бальніцу, бо быў моцны прыступ болю ў спіне. Зараз ён сядзіць на леках, але ўсё роўна не можа сам падняцца раніцай з ложку...

— Вашага сына пракансультуюць спецыялісты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі. Яму толькі патрэбна мець на руках выпіску з гісторыі хваробы, якую далі ў 5-й бальніцы.

— Дзякуй вялікі, але ж праблема ёсць і ў другога, малодшага, сына. Яму — 17 гадоў. Летась у яго моцна забалела левая нага. Раённы неўрапатолаг прапісаў некаторыя прэпараты, але яны не дапамаглі. Нас накіравалі ў Бараўляны. Там паставілі дыягназ — вертэбрагенная люмбалгія злева з умераным болевым сіндромам. Вось ужо мінуў год, але нага ўсё роўна баліць.

— Яму рабілі здымкі пазваночніка?

— Не.

— Пад'едзьце, калі ласка, на паўторную кансультацыю ў абласную бальніцу для грунтоўнага абследавання.

☎ — Вольга Аляксееўна, Мінск. Званю па просьбе сваіх сяброў. Жанчыну нядаўна разбіў інсульт, паралізавала левы бок, з'явіўся дыябет. У Аксакаўшчыне яе гатовы прыняць толькі тады, калі яна сама зможа хадзіць. Надзея на тое, што яна будзе хадзіць, ёсць, аднак пакуль жанчыне патрэбны пастаянны догляд. У яе ёсць дзве дачкі, але ў іх — свае дзеці, яны працуюць... Скажыце, ці ёсць у нашай краіне якія-небудзь магчымасці для забеспячэння пастаяннага догляду для такіх хворых?

— Пытанне аб пераводзе ў аддзяленне рэабілітацыі вырашаецца, калі хворы аднавіў здольнасць да самастойнага перасоўвання. Такіх хворых у нас бяруць у Аксакаўшчыне і ў 2-й мінскай гарадской бальніцы. Калі хворы не аднавіў здольнасць да самаабслугоўвання, ён выпісваецца дадому. Гэта называецца хатнім этапам рэабілітацыі, калі аднаўленчы перыяд працягваецца з удзелам членаў сям'і. Іншых магчымасцяў не існуе.

— А як атрымаць кансультацыю наконт таго, што блізкім трэба будзе рабіць дома?

— Пакуль яна знаходзіцца ў стацыянары, неабходна пагаварыць з інстуктарам-метадыстам лячэбнай фізкультуры, які пакажа, як і што трэба рабіць. Паступова да заняткаў трэба падключаць саму пацыентку, каб яна здаровай рукой дапамагала хворай — уключалася ў працэс рэабілітацыі.

Дазвольце спытаць і пра сябе. У мяне — астэаміэліт левага тазабедранага сустава з 3,5 года. Яго некалі залячылі, і да 25 гадоў усё было нармальна. У інстытуце траўматалогіі мне калісьці паставілі штучны сустаў, але зараз я адчуваю, што пачынаюцца праблемы з пазваночнікам, ён баліць. Куды можна звярнуцца для абследавання і атрымання кансультацыі?

— З улікам таго, што адна нага у выніку перанесенага захворвання ў вас цяпер крыху карацейшая, варта мець на ўвазе, што біямеханіка пазваночніка і суставаў парушана. І гэта будзе спрыяць заўчаснаму з'яўленню астэахандрозу і болевым праяўленням. Нага застанецца такой, як ёсць, і вам трэба навучыцца жыць у такой сітуацыі. Праз кожныя 30—40 хвілін работы за пісьмовым сталом неабходна ўставаць і рабіць фізічныя практыкаванні для суставаў і канечнасцяў. Па-другое, прычынамі боляў могуць быць і болі мышачныя, і болі ў сухажыллях. У гэтым выпадку, зноў жа, неабходна забяспечваць нармальную рухальную актыўнасць. Абавязкова — штодзённыя зарадкі на рабоце і дома. Вельмі пажадана рэгулярна — 1—2 разы на тыдзень — наведваць басейн. Плюс перыядычныя курсы масажу, і калі не проціпаказана, то і дадаць санаторна-курортнае лячэнне.

☎ — Гомель, Іна. Хачу спытаць пра сваю дачку. Ёй 12 гадоў. З 2005 года яна пакутуе ад рэгулярных галаўных боляў, якія суправаджаюцца павышэннем тэмпературы. Дыягназ паставілі — вегета-сасудзістая дыстанія з парушэннем тэрморэгуляцыі. Я спачатку думала, што гэта з-за перагрузак у школе, але і на канікулах — тая ж карціна. Ёй выпісваюць прэпараты для заспакаення, супраць раздражнення.. Але прыступы не адступаюць.

— Што вы маеце на ўвазе пад прыступамі?

— Ёй становіцца дрэнна, моцна сціскае галаву, але прытомнасць яна не губляе. Тады ёй колюць прэднізалон і забіраюць у бальніцу.

— Да якіх лічбаў павышаецца тэмпература?

— Самае большае — 37,8.

— У Гомельскай дзіцячай бальніцы яе абследавалі?

— Там і паставілі дыягназ.

— Вегета-сасудзістая дыстанія даволі часта ў раннім узросце праяўляецца менавіта такім чынам... Вашай дзяўчынцы прапаноўвалі зрабіць спінна-мазгавую пункцыю?

— Не.

— Я магу вам параіць папрасіць у неўрапатолага накірунак на кафедру дзіцячай неўралогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі на кансультацыю.

☎ — Клецк, Аляксандра Васільеўна. У мяне доўгі час баліць шыя злева. Неўрапатолаг прызначаў лячэнне — дыклаберл, дыклафенак. Паляпшэнне не наступае. Зараз лячу яшчэ апорна-рухальны апарат, ногі і спіна крыху абязбольваюцца, а вось у шыі, здаецца, нават пачалося абвастрэнне, бо ўжо не магу павярнуць галаву...

— Здымкі шыйнага аддела пазваночніка вам рабілі?

— Не.

— Куды вы звярталіся?

— У сваю паліклініку... Магчыма, урач вырашыў, што мае праблемы — узроставыя... Мне ж 68 гадоў.

— У любым узросце чалавек павінен жыць нармальна. Вам трэба зрабіць здымак. Звярніцеся паўторна да свайго неўролага, няхай вас накіруюць на здымак. Думаю, што можна падключыць фізіятэрапію. Напрыклад, магнітатэрапію.

— У мяне праблемы і з сэрцам, і жоўцевы пузыр выдалілі.

— Думаю, можна наладзіць для вас кансультацыю ў Мінскай абласной бальніцы. Пад'язджайце да неўрапатолага ў Бараўляны.

☎ — Лельчыцкі раён, Аляксандр Канстанцінавіч. Мне 68 гадоў. Дыягназ — атэрасклероз сасудаў ніжніх канечнасцяў, хранічны панкрэатыт у стадыі рэмісіі, хранічны халецыстыт у стадыі рэмісіі, цукровы дыябет 2-га тыпу, дэфармуючы астэаартроз правага тазабедранага сустава 3-й ступені, правага каленнага сустава 2-й ступені, другасная вертэбрагенная люмбалгія. Рэкамендавана — пратэзаванне. Дапамажыце, моцна баліць і спіна, і нага...

— У вас выражанае паражэнне суставаў, і адсюль, канешне, болі. У вас цэлы букет захворванняў, і назапасілася шмат змяненняў у суставах і пазваночніку — яны незваротныя. Я не магу сказаць, што нейкі канкрэтны від лячэння вам адмыслова цяпер дапаможа. Сапраўды, можна паставіць пратэз, але гэта пытанне вырашаюць артапеды.

— Але з цукровым дыябетам не хочуць браць...

— Значыць, вам трэба перыядычна прымаць прэпараты, якія змяншаюць болі ў тазабедраных суставах. І вам трэба абавязкова рухацца, нават калі ёсць болі. Іншага выйсця няма. Вырашайце схемы лячэння ў абласной бальніцы.

☎ — Рагачоў, Пётр Міхайлавіч. Мне 48 гадоў. Рассеяны склероз. Парэз выражаны ў правай назе, парушэнне функцыі перасоўвання, мазжачковая атаксія, парушэнне функцыі тазавых органаў. Прымаў дэксаметазон і прэднізалон. Скажыце, а лейкладзін лепш за гэтыя прэпараты?

— Нельга сказаць, горшы ён ці лепшы, таму што для прызначэння таго ці іншага прэпарата ёсць свае паказанні. У вас зараз стан абвастрэння ці стацыянарны стан?

— Стацыянарны. Гадоў пяць таму, праўда, крыху меншымі дозамі прызначаліся прэпараты.

— Калі ваш стан зараз стабільны, то падстаў для прызначэння глюкакартыкоідных гармонаў або цытастатыкаў няма. Вам патрэбны разумныя рацыянальныя фізічныя нагрузкі. Можна прымяняць метабалічную тэрапію двойчы на год на працягу 1—1,5 месяца. Актыўную тэрапію не рэкамендую выкарыстоўваць.

— А яшчэ: два гады таму была выяўлена міжпазванковая грыжа, пратрузія без прыкмет кампрэсіі.

— Гэта ў вас праяўленне астэахандрозу. З улікам вашай абмежаванай фізічнай актыўнасці можна сказаць, што астэахандроз можа прагрэсаваць крыху хутчэй, таму практыкаванні для пазваночніка трэба рабіць штодня, а перыядычна — курсы масажу.

— Я чуў, што ёсць беларускі апарат квантавай тэрапіі.

— Яго можна выкарыстоўваць у хатніх умовах.

— Падводны душ-масаж можна праводзіць?

— Пры рассеяным склерозе не рэкамендую.

— Я ніколі не рабіў плазмаферэз...

— Гэта вельмі магутны спосаб лячэння. Можа даваць і пабочныя эфекты. У вас паказанняў для яго правядзення няма, таму не варта.

☎ — Веньямін Іванавіч, званю з горада Глыбокае. 74 гады. Баліць галава, ёсць галавакружэнне. Выпісваюць прэпараты для расшырэння сасудаў, але галаўны боль не праходзіць.

— Хутчэй за ўсё, у вас ёсць атэрасклероз сасудаў галаўнога мозга. А які ў вас ціск?

— Было і 120, і 170. Пасля бальніцы — у межах 150 і часам падае да 100.

— Вы прымаеце прэпараты ад ціску?

— Настой жэньшэню і піў моцны чай.

— Гэта, відаць, калі ціск паніжаецца... Я магу сказаць, што сасуды вашы змяніліся і каб палепшыць кровазварот галаўнога мозга неабходна прымаць прэпараты для зніжэння ціску і паляпшэння крывятоку. Неабходна менш ужываць у ежу салёнага, вострага. Дыета для спынення прагрэсавання атэрасклерозу вельмі важная.

☎ — Валянціна Аляксандраўна. Капыльскі раён. Мне штосьці паміж лапаткамі баліць. Правы бок ажно гарыць. Рабілі ўколы дыклафенаку, дыклаберл піла, прапісалі хандразамін і неўрабэкс.

— А здымак вам рабілі?

— Не рабілі.

— Хутчэй за ўсё, у вас астэахандроз, але трэба зрабіць здымак, каб у гэтым пераканацца. Трэба прымяняць лекавыя прэпараты, але ёсць і фізіялячэнне. Працэдур вельмі многа. Іх павінен прызначыць урач. Неабходна крыху ўзмацніць лячэнне, зрабіць яго комплексным, а дыклаберл можна памяняць на іншы прэпарат. Эфект будзе больш моцным.

☎ — Вера Сямёнаўна. 76 гадоў. Стаўбцоўскі раён. Як пазбавіцца болю ў паясніцы, які аддае ў нагу?

— Першае, што нельга рабіць пры болях у спіне — спаць на жываце. Толькі на баках ці на спіне.

— Ногі тузаюць, круцяць. Летам — жар у нагах адчуваю, зімой — яны мерзнуць.

— Магчыма, штосьці з венамі. Падкладвайце што-небудзь пад ногі, калі ляжыце. Прымайце прэпараты для паляпшэння крывятоку. Выкарыстоўвайце націранні.

— Хандраксідам два разы спрабавала.

— 10—12 дзён можна гэтай маззю націрацца. Часцей разгружайце пазваночнік і суставы — адпачывайце.

☎ — Барыс Канстанцінавіч са Слоніма. 84 гады. У мяне ў сэрцы — блакада, кардыястымулятар паставілі. Берліпрыл-5 прымаю ад ціску, для нармалізацыі халестэрыну — кардыямагніл-75. Ціск і халестэрын зараз у норме, але з'явіўся шум у вушах. Дыягназ — цэрэбральны атэрасклероз. Пірацэтам выпісалі. Я прымаў з перапынкам тры ўпакоўкі па 60 таблетак. Шум не знік. Другі неўрапатолаг паставіў мне дыягназ — атэрасклероз сасудаў галаўнога мозга і прапісаў 10 уколаў. Але шум не праходзіць.

— Шум у вушах і галаве з'яўляецца праяўленнем атэрасклератычнага паражэння сасудаў галаўнога мозгу. У вас ёсць яшчэ і атэрасклератычнае паражэнне сасудаў сэрца. Для таго, каб зменшыць гэтыя праяўленні, патрэбна працяглая тэрапія, пакольскі гаворка ідзе пра хранічную праблему. Доктар павінен вырашыць, з дапамогай якіх прэпаратаў будзе праводзіцца лячэнне.

☎ — Валянціна Уладзіміраўна. Горад Барысаў. Мне 44 гады. З 20 гадоў непакояць галаўныя болі — баліць верхняя, лобная, частка. П'ю цытрамон. Раней, праўда, дапамагала 1,5 таблеткі, а зараз — тры. Галава можа балець па пяць дзён. З інтэрвалам — 7—10 дзён.

— Тут можа ісці гаворка пра мігрэнозны галаўны боль. Вы паказваліся спецыялістам?

— Не.

— Неабходна правесці агляд у неўролага. Калі мае меркаванні пацвердзяцца, то ўрач прызначыць вам адпаведныя прэпараты — іх цяпер многа. А цытрамон проста выкарпаў свае магчымасці.

На прамой лініі дзяжурылі Святлана БРЫСЕНКА і Вольга ШАЎКО.

(Працяг будзе.)

ВІТАМІНЫ — НА СНЕДАННЕ, ВІТАМІНЫ — НА АБЕД...

Прымаць вітаміны і мінералы сёння стала вельмі папулярна. Кожны ведае, што яны з'яўляюцца важнай часткай паўнацэннага рацыёну. Але ці заўсёды ўжыванне вітамінаў бяспечнае? Каму яны жыццёва неабходныя, а каму, наадварот, проціпаказаны? Перш-наперш, трэба разабрацца, што ж такое вітаміны.

Вітаміны (у перакладзе з лацінскай мовы «неабходныя для жыцця») — гэта арганічныя рэчывы, якія з'яўляюцца незаменнымі кампанентамі нашага харчавання. Самі па сабе вітаміны не ўваходзяць у састаў тканак арганізма, не з'яўляюцца крыніцай энергіі. Аднак менавіта яны — «актыватары» многіх біяхімічных рэакцый, якія забяспечваюць нармальнае цячэнне фізіялагічных працэсаў дыхання, кровазвароту, страўвання, імунітэту, росту і г.д. Усе вітаміны падраздзяляюцца на тлушча- і водарастваральныя. Да першых адносяць вітаміны A, D, E, K. Водарастваральнымі з'яўляюцца вітаміны групы B: B_1, B_2, B_5, B_6, B_{12}, B_c, вітаміны C, H, PP.

На працягу стагоддзяў людзі атрымлівалі вітаміны адзіным спосабам — з ежай. Але, паводле сцвярджэння многіх вучоных, сёння наш рацыён страціў ранейшую разнастайнасць. Сняданне, абед і вячэра сучаснага чалавека зведзены да вузкага стандартнага набору некалькіх асноўных груп прадуктаў і гатовых страў. Акрамя таго, узрасла доля прадуктаў, якія падвергліся кансерваванню, працягламу захоўванню, інтэнсіўнай тэхналагічнай апрацоўцы, што непазбежна вядзе да істотнай страты вітамінаў. Спецыялісты зазначаюць: нават збалансаваны па асноўных пажыўных рэчывах — бялках, тлушчах і вуглеводах — рацыён з'яўляецца дэфіцытным на 20—30 % па ўтрыманню вітамінаў. І гэты дэфіцыт практычна не зніжаецца нават у такія «вітамінныя» поры года, як лета і восень. Таму прыём сінтэтычных вітамінных прэпаратаў з'яўляецца найбольш абгрунтаваным выйсцем пры іх недахопе.

На сённяшні дзень існуюць мона- (змяшчаюць толькі адзін вітамін) і разнастайныя полівітамінныя комплексы. Звычайна монавітамінныя прэпараты выкарыстоўваюцца пры розных захворваннях, лячэнне якіх патрабуе дадатковага ўвядзення вітамінаў у дозах, што значна перавышаюць сутачную патрэбнасць. Напрыклад, пры псарыязе (захворванне, асноўным сімптомам якога з'яўляецца пашкоджанне скуры) вітамін A прымяняецца ў дозе, якая перавышае сутачную патрэбнасць у 10 разоў. Дарэчы, пасля лячэння вітамінам A у высокіх дозах цяжарнасць варта планаваць не раней чым праз 6 месяцаў пасля заканчэння курсу тэрапіі, інакш магчымае неспрыяльнае ўздзеянне на плод.

Полівітамінныя комплексы выкарыстоўваюцца для прафілактыкі, а таксама для лячэння розных формаў гіпавітамінозу — стан, які характарызуецца рэзкім, але не поўным, як пры авітамінозе, змяншэннем запасаў вітамінаў у арганізме.

Прычыны, якія вядуць да поўнага або частковага дэфіцыту вітамінаў у арганізме, можна падзяліць на ўнутраныя і знешнія. Першыя звычайна звязаны з рознымі хваробамі або спецыфічнымі станамі, пры якіх парушаецца баланс паміж патрэбнасцю і забеспячэннем арганізма вітамінамі. Такі дысбаланс могуць выклікаць хваробы страўніка-кішачнага тракту, якія пагаршаюць усмоктванне і засваенне вітамінаў з ежы. Пры цяжарнасці і ў перыяд грудного кармлення значна павышаецца патрэбнасць у вітамінах і мінеральных рэчывах, якія неабходныя для нармальнага росту і развіцця дзіцяці. Дадатковы прыём вітамінаў таксама неабходны пры вялікай фізічнай нагрузцы, неспрыяльных умовах працы, у спякотным клімаце і г.д. Незбалансаваныя дыеты, галаданне, прыём медыкаментаў, няправільнае захоўванне і прыгатаванне прадуктаў адносяцца да знешніх фактараў, якія выклікаюць гіпавітаміноз. Перашкаджаюць засваенню вітамінаў:

алкаголь — вымывае з арганізма вітаміны A, усёй групы B, а таксама кальцый, цынк, калій, жалеза, магній;

нікацін — разбурае вітаміны A, C, E і селен;

кафеін (больш за 3 кубкі ў дзень) — «забівае» вітаміны B, PP, зніжае ўтрыманне ў арганізме жалеза, калію, цынку, кальцыю;

аспірын — змяншае ўтрыманне вітамінаў групы B, C, A, таксама калію і кальцыю;

снатворныя сродкі — ускладняюць засваенне вітамінаў A, D, E, B_{12}, моцна зніжаюць узровень кальцыю;

антыбіётыкі — разбураюць вітаміны групы B, жалеза, кальцый, магній.

Дэфіцыт вітамінаў найбольш часта праяўляецца агульнымі сімптомамі: павышанай стамляльнасцю, санлівасцю, зніжэннем апетыту, дэпрэсіяй. Аднак няхватка кожнага вітаміну можа праяўляцца і шэрагам спецыфічных адзнак.

Дарэчы, лішак вітамінаў некалькі не лепшы за няхватку: павышаныя дозы шэрагу вітамінаў часам выклікаюць цяжкія таксічныя рэакцыі. Пры перадазіроўцы вітаміну A могуць назірацца болі ў жываце, павелічэнне печані і селязёнкі, страўнікава-кішачныя расстройствы, выпадзенне валасоў, сверб, сустаўныя болі, ваніты. Пры прымяненні надзвычай высокіх доз вітаміну D можа з'явіцца слабасць, цяжкае дыханне, панос, часам павышаецца ціск, замарудзваецца пульс. Вялікія дозы аскарбінавай кіслаты выклікаюць пераўзбуджэнне нервовай сістэмы, павялічваецца рызыка ўтварэння камянёў шчаўлевай кіслаты ў нырках, развіцця запалення мачавога пузыра. Пры перадазіроўцы фоліевай кіслаты з'яўляецца раздражненне скуры, а пры «пераборы» вітаміну E павышаецца артэрыяльны ціск. Памятайце, што аптымальным з'яўляецца ўтрыманне ў комплексе вітамінаў у дозе, не меншай як 30 працэнтаў, а лепш 50—100 працэнтаў сутачнай патрэбнасці.

Пры прафілактычным прыёме вітамінных прэпаратаў курс лячэння звычайна складае 1—2 месяцы. Пры пастаянным або працяглым уздзеянні фактараў, якія павышаюць патрэбнасць у вітамінах (цяжкая фізічная праца, заняткі спортам), працягласць курсаў павялічваецца да 2—4 месяцаў. Водарастваральныя вітаміны лепш засвойваюцца, калі іх прымаць за 30—60 хвілін да яды, запіваючы вадой. Найбольш актыўнае засваенне тлушчарастваральных вітамінаў адбываецца пры прыёме вітамінных комплексаў падчас або пасля яды. Полівітамінныя прэпараты, якія, як правіла, змяшчаюць і вода-, і тлушчарастваральныя вітаміны, рэкамендуецца прымаць падчас яды.

Канешне, любы вітамінны комплекс сёння можна купіць у аптэцы без рэцэпта, аднак лепш пры падборы прэпарату пракансультавацца з урачом.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Вітамін	Адзнакі гіпавітамінозу
A (рэцінол)	Пагаршэнне змрочнага зроку (курыная слепата), галаўныя болі, лушчэнне скуры
B_1 (тыямін)	Нервова-псіхічныя парушэнні, парушэнне памяці, ірвота, зрыгванне, запоры
B_2 (рыбафлавін)	Дэрматыт (запаленне скуры, якое праяўляецца яе пачырваненнем, ацёчнасцю, лушчэннем, свербам) носагубнога трохвугольніка, трэшчыны і запаленне ў кутках рота, запаленне вачэй, слёзацячэнне
B_5 (пантатэнавая кіслата)	Мышачныя болі, пашкоджанне скуры, валасоў (пасівенне, аблысенне)
B_6 (пірыдаксін)	Запаленне слізістых абалонак поласці рота, лушчэнне скуры на лбе, носагубных складках, неўрыты (запаленне нерваў), сутаргі
B_{12} (кабаламін)	Анемія, полінеўрыт
B_c (фоліевая кіслата)	Анемія, панос, пагаршэнне зажыўлення ран
C (аскарбінавая кіслата)	Зніжэнне імунітэту, анемія, запаленне дзяснаў
PP (нікацінавая кіслата)	Раздражнёнасць, мышачная слабасць, панос
H (біяцін)	Себарэйны дэрматыт (перхаць, тлустая скура, вугры), выпадзенне валасоў
P (руцін)	Павышаная ломкасць капіляраў (схільнасць да ўтварэння сінякоў)
D (кальцыферол)	Патанчэнне зубной эмалі, зніжэнне вагі, размякчэнне косці
E (токаферол)	Мышачная дыстрафія, парушэнне работы сардэчнай мышцы, парушэнне рэпрадуктыўнай функцыі
K	Кроватачывасць дзяснаў, насавыя, страўнікавыя крывацёкі

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 6 (11).

«Базар 2007»: каледаскоп падзей

ТАМ ТВОРЧЫ ДУХ, ТАМ СВЯТАМ ПАХНЕ...

Фестывальнае надвор'е традыцыйна непрадказальнае: то сонца прыпячэ, насуперак прагнозам сіноптыкаў, то літаральна праз некалькі хвілін дождж стаіць сцяной (на сольным канцэрце Валерыя Лявонцьева разыгралася навальніца такой сілы, што часам адмаўлялася працаваць апаратура — але абноўлены дах Летняга амфітэатра «баявое хрышчэнне» паспяхова вытрымаў). І толькі надвор'е душэўнае, у сэнсе агульнага настрою, нязменна сонечнае:

ВІЦЕБСК ГУЛЯЕ!

Летні амфітэатр і абласная філармонія, Дом кіно і тэатр імя Якуба Коласа, краязнаўчы музей, «горад майстроў» у парку імя Фрунзе, Міжнародны прэс-цэнтр... Жыццё віруе на ўсіх гэтых пляцоўках, і часам мы з калегамі, як тая малпа, проста не ведаем, як бы гэта «разарвацца» на некалькі частак, каб ўсюды паспець. Найлягчэй назіраць за сваімі, беларускімі артыстамі. І не дзіўна — сёлета наша дэлегацыя вялікая, як ніколі. Калі раней творчы «дэсант» у Віцебск абмяжоўваўся 100—150 чалавекамі, то на гэты раз — каля 600.

«Беларускі дзень», які прайшоў у Віцебску адначасова з Днём горада, стаў адным з самых насычаных і — амаль паміж радкоў заўважым — адным з самых запатрабаваных. Калі на канцэрт урачыстага адкрыцця «Славянскага базару ў Віцебску» было прададзена 100 працэнтаў білетаў, то на гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі — больш за 90, у той час як некаторыя іншыя канцэрты збіралі толькі палову залы. Што да збору на адной сцэне зорак «Еўрабачання», то, быць можа, у зале некаторыя крэслы і пуставалі, але ля агароджы арткафэ да апошняга шчыльнай сцяной стаялі людзі, якія жадалі сфатаграфаваць сваіх куміраў або ўзяць аўтограф. «Гэты канцэрт — падарунак нашым беларускім гледачам за іх увагу і падтрымку праекта на ўсіх яго этапах», — паведамілі арганізатары. Праўда, атрымаюць гледачы гэты падарунак толькі ў верасні — калі будзе паказана тэлеверсія канцэрта. Тады ж будзе канчаткова рэалізавана і цікавая «фішка»: падчас канцэрта публіцы даваўся шанц адзначыць на білеце таго выканаўцу, хто варты прадставіць Беларусь на «Еўрабачанні-2008», што пройдзе ў Сербіі, а ў верасні вынікі галасавання будуць падведзены. Зрэшты, галасаванне ні на што не паўплывае — толькі дасць карціну чаканняў аўдыторыі, гэткія папярэднія стаўкі.

«Можа, фаварыту гледачоў усё ж будзе дадзены нейкі бонус — бо Дзіму Калдуну ў свой час крэдыт даверу таксама выдалі менавіта гледачы?» — пацікавіліся мы ў арганізатараў канцэрта. Адказ, на жаль, будучых кандыдатаў не парадуе: калі вас любіць публіка — гэта цудоўна, але звычайную схему конкурснага адбору ніхто не адмяняў, і яе давядзецца прайсці.

Дарэчы, як адзначыў арганізатар гэтага канцэрта, кіраўнік тэлепраекта «ЕўраФэст» Аляксандр Ціхановіч, правільнай назвай мерапрыемства з'яўляецца ўсё ж «ЕўраФэст»—«Славянскі базар» — Песні дружбы». Крыху пазней стала зразумела, чаму так: колькасць беларускіх і проста пабочных артыстаў значна пераважала над колькасцю ўдзельнікаў і лаўрэатаў «Еўрабачання». Апошніх, уласна кажучы, можна было нават па пальцах пералічыць: Марыя Шэрыфавіч (Сербія), Наталля Барбу (Малдова), Марыя Шэсціч (Славенія), Дзіма Калдун (Беларусь), Дана Інтэрнэйшнл (Ізраіль), Ціна Караль (Украіна). Верка Сярдзючка, якая прымала ўдзел у канцэрце адкрыцця і нават падахвоціла кіраўніка нашай краіны на танец, з-за шчыльнага гастрольнага графіку надалей на фестывалі не засталася. Філіп Кіркораў увогуле не прыехаў — паводле адных звестак, не змог, па другіх — нават і не быў запрошаны... Калі на канцэрт пачалі ўжо разыходзіцца білеты, адмовіўся ад выступлення расійскі гурт «Серабро» — кажуць, з-за больш важнага выступлення. Так што гонар Расіі засталася абараняць толькі Аніта Цой — яна ж старшыня міжнароднага музычнага дзіцячага конкурсу. Чамусьці ў тэрміновым парадку пакінула Віцебск і Анжэліка Агурбаш, якая села ў машыну праз паўгадзіны пасля выступлення на «беларускім» канцэрце, а яе імя выкраслілі з праграмы. А Дзіма Калдун, які выходзіў на сцэну некалькі разоў, трапіў у форс-мажор: дзесяткі разоў адпрацаваная пастаноўка «Work Your Magic» раптам дала збой, і з-за няправільна заражданай піратэхнікі феерверкі ледзьве не абпалілі твары танцорам... Гурту «Da Vinci» увогуле не пашанцавала: канцэрт настолькі зацягнуўся, што бліжэй да пятай раніцы музыкантам засталося толькі павітаць гледачоў і... пакінуць сцэну, нават не праспяваўшы. Што і як было з астатнімі выканаўцамі — глядзіце ў верасні...

На беларускім гала-канцэрце адной з цікавых падзей стала маштабная прэзентацыя новага складу — дакладней, рэйнкарнацыі — ансамбля «Верасы». Зараз гэта дзве дзяўчынкі і два юнакі, якіх мастацкаму кіраўніку ВІА Васілю Раінчыку, паводле яго ўласнага выказвання, «Бог паслаў». «У іх напарадзе вялікая будучыня, я ўпэўнены», — катэгарычна абвясціў прафесар. Ідэя ўз'яднання «Верасоў» лунала ў паветры даўно, але рэалізаваная была толькі зараз. І ўжо выклікала як захапленні, так і нараканні. Прычым з крытычнымі заўвагамі адной з першых выступіла... колішняя ўдзельніца і «зорка» ансамбля Ядвіга Паплаўская. «Вы прабачце за такую, быць можа, занадта эмацыйную рэакцыю, але для мяне «Верасы» — гэта дыягназ, а для Васіля Раінчыка — спосаб заробку грошай. Калі я была на канцэрце ў Мірскім замку, то глядзела з акна машыны і здзіўлялася: як Вася Раінчык, добры музыкант, моцны піяніст, якога мы з Сашам некалі прывялі ў ансамбль, мог дазволіць, каб песні «Верасоў» гучалі ў такім варыянце? Было такое адчуванне, што гэта караоке пад мелодыі, скачаныя з Інтэрнэта, — скардзілася артыстка. — Гэтыя юнакі і дзяўчаты — яны неблагія выканаўцы, але пакуль што гэта проста квартэт з не вельмі высокім мастацкім узроўнем, ім трэба расці да таго, каб мець права насіць назву «Верасы». Зрэшты, «новынароджанаму» калектыву няма яшчэ і трох месяцаў — так што, верагодна, варта пачакаць, перш чым хваліць або крытыкаваць гэтых маладых артыстаў.

Затое што датычыцца артыстаў сталых, яны парадавалі прыхільнікаў. У рамках фестывалю былі прэзентаваныя два альбомы: Ірына Дарафеева прадставіла зусім свежанькую пласцінку «Я хачу быць марай», а Якаў Навуменка — зборнік «Залатыя песні», куды ўвайшлі добра вядомыя з савецкіх часоў хіты: «Лада», «Калодзеж», «Гарадскія кветкі», «Усходняя» і г.д. Плануецца, што «Залатыя песні» стануць серыяй, куды ўвойдуць як мінімум пяць альбомаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

БЕЛАРУСКАЯ ШКОЛА МАСТАКА ШЭМЯКІНА

Вядомы мастак Міхаіл Шэмякін, які мае амерыканскае грамадзянства, па прапанове Прэзідэнта нашай краіны плануе адкрыць у Беларусі ювелірную майстэрню, дзе збіраецца падзяліцца сваімі сакрэтамі з беларускімі талентамі.

Тут у Ратушы адкрылася выстава яго твораў. Падчас адкрыцця экспазіцыі ён падзяліўся ўражаннямі аб знаходжанні ў Беларусі. Падкрэсліў, у прыватнасці, што ў нас многае робіцца для паляпшэння жыцця простых людзей. Дарэчы, ён мае намер запрашаць маладых мастакоў на стажыроўкі ў свае майстэрні ў ЗША і Францыю і паралельна пажадаў падтрымліваць творчыя сувязі з ужо вопытнымі творцамі. Яшчэ падзяліўся ідэяй адкрыцця ў краіне філіяла яго інстытута філасофіі, псіхалогіі і творчасці. Канцэрт адкрыцця «базару» прыемна здзівіў спадара Шэмякіна, які раней шмат чаго добрага чуў пра віцебскі фестываль, і пажадаў убачыць гэтае грандыёзнае свята на свае вочы. Хадзіў па кніжных крамах, каб набыць выданні, прысвечаныя мастакам нашай рэспублікі мінулага і сучаснага.

ДЗЕНЬ МОЛАДЗІ

Дзень моладзі ўпершыню афіцыйна быў абазначаны ў праграме 16-га міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Ён прайшоў у мінулую нядзелю.

Падчас Дня ў цэнтры Віцебска адбыўся кірмаш праектаў маладзёжных ініцыятыў, упрыгожылі сімвалічнае «Дрэва дружбы», разыгралі бясплатную латарэю, самым дастойным у ганаровых абставінах уручылі пашпарты, дыджэі з усіх рэгіёнаў прадэманстравалі свае таленты...

1-ы сакратар ЦК БРСМ Леанід Кавалёў, адказваючы на пытанне карэспандэнта «Звязды», адзначыў, што ў апошні час значна пашыраюцца міжнародныя сувязі самай маладзёжнай арганізацыі Беларусі. У прыватнасці, «на выхадзе» супрацоўніцтва ва ўсіх сферах з моладдзю Кубы, Венесуэлы, абмяркоўваецца пытанне цесных сувязяў з моладдзю Туркменістана і іншых краін.

Што датычыцца задачы перайсці БРСМ на самафінансаванне, яна рэальная. Напрыклад, вельмі актыўна працуе маладзёжная турыстычная арганізацыя «Спадарожнік», з прыбыткам у 120 мільёнаў летась спрацавала радыёстанцыя «Пілот-FM» (і хутка яе можна будзе пачуць на Віцебшчыне). Электронная латарэя «Юнацтва», на думку кіраўнікоў ЦК, можа прынесці арганізацыі вялікія грошы. Ды і ўзносы членаў БРСМ — 120—150 мільёнаў рублёў у год таксама дапамогуць у самафінансаванні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

КАЛДУНСКІ НАПОЙ ПА ЗОРНАЙ ЦАНЕ

У аддзелах алкагольнай прадукцыі беларускіх магазінаў — навінка! Днямі ў продаж паступіла гарэлка «Калдун» мінскага завода «Крыштал». Першыя 400 бутэлек напою былі выпушчаны ў якасці сувенірнай прома-прадукцыі для «Еўрабачання». Пасля добрых водгукаў фінаў і гасцей фестывалю было прынятае рашэнне паставіць выраб «на канвеер». Гарэлка гэта сапраўды незвычайная: дзякуючы таму, што настоеная на сапраўдным срэбры, яна, як сцвярджаюць вытворцы, мае лекавыя ўласцівасці (калі не захапляцца колькасцю). Купіць «чарадзейны эліксір» можна па «зорнай» цане — амаль за 83 тысячы рублёў.

Таццяна ДАНІЛУШКІНА.

ПАСЛЯ «БЕЛЫХ РОСАЎ» — НОВЫ РУБЕЖ

Праз 25 гадоў з невялікім пасля выхаду «Белых росаў» Аляксей Дударaў ізноў прапанаваў сцэнарый, які перамог у конкурсе і будзе экранізаваны на кінастудыі «Беларусьфільм».

Конкурс праводзіўся з 26 лютага па 30 чэрвеня, выявіў цікавасць людзей да стварэння кінасцэнарыяў. Конкурс быў прысвечаны Дню Незалежнасці, таму шырокая тэматыка прадстаўленых на яго сцэнарыяў. Усяго было пададзена больш за 150 заявак, з якімі працавала адборачная камісія. Спачатку адабралі 133 сцэнарыі для больш дэталёвага вывучэння. 16 сцэнарыяў было прадстаўлена членам журы. Упершыню праводзілася мастацкая рада, дзе ішло абмеркаванне. Спецыяльна распрацаваная шкала адзнак дае магчымасць ацаніць усе вартасці і недахопы сцэнарыя, на думку прафесіяналаў кінасправы. Такім чынам выявіліся лідары. Дзве прапановы выклікалі найбольшую цікавасць журы з васьмі чалавек. Наталля Сцяжко, рэдактар кінастудыі, як старшыня журы, мела права на два галасы. Большасць з іх аказалася на баку «Дняпроўскага рубяжа».

Першая прэмія будзе ўручана вядомаму драматургу Аляксею Дудараву за сцэнарый ваеннай драмы «Дняпроўскі рубеж». Некалі менавіта дзякуючы конкурсу на лепшы кінасцэнарый з'явіўся фільм рэжысёра Ігара Дабралюбава «Белыя росы». Цяпер мастацкі кіраўнік Драматычнага тэатра Беларускай арміі прапанаваў гісторыю, якая ўжо знайшла адлюстраванне на тэатральнай сцэне. Але ў кіно больш шырокая аўдыторыя, а ваенная тэма для Беларусі, здаецца, — вечная.

Падзеі вайны «дастаюць» герояў сцэнарыя фільма «Ліда» беларускі Елізаветы Трусевіч, якая вучыцца на сцэнарным факультэце Усерасійскага Дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі. Яна нарадзілася ў Гродне, ёй толькі 21 год, але дзяўчына прыдумала цікавую пасляваенную гісторыю. Салдат вярнуўся з вайны. Але жонка знаходзіць у яго фотаздымак, на адваротным баку якога напісана — «Ліда». Яна падазрае яго ў няверпасці, але, імкнучыся разабрацца, даведваецца, што Ліда — гэта горад, дзе на долю мужа выпалі сур'ёзныя выпрабаванні.

Трэціх прэмій прысуджана адразу тры — за кошт таго, што сцэнарыяў на экранізацыі літаратурных твораў ніхто ўвогуле не прапанаваў. А шкада — гэта магутная плынь, на якой трымалася беларускае кіно ў савецкі час. Натуральна, з творамі вядомых пісьменнікаў трэба ўмець працаваць ашчадна. Прасцей часам прыдумаць сваё.

Першую трэцюю прэмію атрымае Анатоль Жук, артыст ТЮГа за гісторыю пра людзей, якія ў шаноўным узросце апынуліся ў адзіноце. «За любоўю любоў, або Адны» называецца сцэнарый яго меладрамы.

Другую трэцюю прэмію прысудзілі за сцэнарый да прыгодніцкага фільма пад назвай «Бяссмерце каштуе нам жыццяў». І гэта сапраўды адкрыццё, таму што аўтар Тацяна Швядко была звычайнай дзяржаўнай служачай, а зараз даглядае маленькае дзіця.

Былы вайсковец Аляксандр Дзебалюк, які, праўда, цяпер мае адносіны да кінагаліны, напісаў пра тое, што добра ведае. Яго сцэнарый баевіка «Крапавы бярэт» распавядае пра беларускіх спецназаўцаў.

«Сцэнарыі былі вельмі розныя па жанрах, ад баевікоў да мелаграм, даволі таленавітыя. Таму зняць фільмы можна не толькі паводле пераможнага сцэнарыя. Прыемна, што людзі адгукнуліся і вынікі конкурсу нас парадавалі. Прыкладна 15 працэнтаў сцэнарыяў былі даволі прафесійныя. Падчас конкурсу мы адзначылі каля 30 перспектыўных аўтараў, з якімі можна супрацоўнічаць. Мы і надалей будзем ладзіць конкурсы, гэта дае прыток новых ідэй, звяртае ўвагу на нейкія яшчэ нераспрацаваныя тэмы. Пры кінастудыі павінна з'явіцца сцэнарная лабараторыя, якая будзе звяртаць увагу на тую ці іншую прапанову, з якой далей можна працаваць. Гэта, дарэчы, сусветны вопыт», — адзначыла Наталля Сцяжко.

Што да пераможцы, то здымкі фільма «Дняпроўскі рубеж» стануць галоўнай працай наступнага года, нацыянальным кінапраектам. На думку рэдактара кінастудыі, гэта будзе дарагая карціна — ваенныя сцэны нельга здымаць дрэнна.

Сам аўтар Аляксей Дударaў лічыць, што рабіць карціну вельмі дарагой, з грандыёзнымі батальнымі сцэнамі, можа, і не варта, таму што за гэтым можна згубіць зерне карціны. Сяброўства, любоў і гераізм у ёй павінны ісці паралельна з ваеннымі падзеямі. Менавіта ваенны час праяўляе найлепш характары людзей, якія апынуліся ў складаных умовах. Аўтар сцэнарыя хацеў бы, каб гэты кінапраект стаў нацыянальным і па складу акцёраў, якія будуць у ім занятыя: у нас дастаткова сваіх зорак. Але ці пагодзіцца з ім будучы рэжысёр фільма? Мастацкі кіраўнік кінастудыі «Беларусьфільм», рэжысёр Аляксандр Яфрэмаў выказаў зацікаўленасць у працы над гэтым праектам, які, напэўна, дасць глебу яшчэ не адной публікацыі.

Аляксей Дударaў пракаментаваў навіну аб сваёй перамозе так:

— Я ўжо не першы дзесятак гадоў кажу: трэба рабіць сваё кіно. Свой тэатр у нас ёсць. А кіно — тая галіна, якая больш шырока можа заведчыць аб нашай адметнасці. Думаю, калі б з 15 фільмаў 10 былі нашай вытворчасці, студыя была б вельмі прыбытковай. Вельмі радасна, што ёсць такая перспектыва, і мы можам чакаць ад кінагаліны яркіх падзей. Сапраўды, нам ёсць пра што расказаць, ёсць чым ганарыцца. У нас на кінаэкранах яшчэ няма сваіх слынных герояў, якіцэ якіх вартае адлюстравання. Мы павінны заявіць пра тое, што Беларусь — багатая краіна. Багатая гісторыяй, дзе было цікаваў Сярэднявечча, можа, больш багатае, чым англійскае, дзе жылі асобы, якія ўплывалі на лёс многіх народаў, пакінулі след у еўрапейскай культуры. Паэтызаваць сваю гісторыю, ганарыцца дасягненнямі — гэта і ёсць патрыятызм.

Сцэнарый, які я прапанаваў на конкурс, таксама патрыятычны. Ён прысвечаны абароне Магілёва. Менавіта там, згодна з гістарычнымі сведчаннямі, была першая перамога над вермахтам. Перамога была ўжо ў тым, што немцаў тут здолелі затрымаць на 23 дні. Для адладжанай фашысцкай машыны, якая на пачатку вайны не сустракала вялікіх праблем на сваім шляху, гэта быў шок, немцы здзівіліся, што іх могуць затрымаць. Пад Масквой яны ўжо гэтаму не здзіўляліся, таму што былі гатовыя да сур'ёзнага процістаяння. Калі я пачаў вывучаць матэрыялы магілёўскага музея, дык здзівіўся таму подзвігу, пра які не так шырока вядома. Мы сціплыя, дзелім свае перамогі з астатнімі. Сёння некаторыя дзеячы суседніх краін кажуць, маўляў, беларусы прапусцілі фашыстаў праз сваю тэрыторыю далей. Але вельмі дзіўна чуць такія выказванні сёння, калі адкрываюцца новыя факты накант падрыхтоўкі Савецкай Арміі да вайны, калі вядома, што рабілася ў першыя месяцы вайны, які панаваў шок сярод людзей, але яны знаходзілі сілы змагацца. Вядома, што мы найбольш пацярпелі ў Другой сусветнай вайне. Менавіта Беларусь панесла самыя вялікія страты з усіх народаў на зямным шары, не трэба пра гэта забывацца.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ЗВАННЕ НАРОДНАГА МАСТАКА...

Падлетак Толя Анікейчык за работай.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— А якім быў Анатоль Аляксандравіч сам — па натуры, па характару?

— Чалавек надзвычай экспансіўны, шчыры, які даволі лёгка падаваўся свайму настрою. Але разам з тым вельмі справядлівы і вельмі добры. Такое вось спалучэнне... Часам некаторыя людзі і крыўдзіліся за, магчыма, надта рэзкае, эмацыянальнае яго выступленне, але ўсё роўна не было адчування зла. Такі ён чалавек... Яго дакладная копія — наша дачка Вольга. Яна падобная на бацьку і знешне, і ўнутрана. Ён браў яе заўсёды з сабой — на дэманстрацыі, на агульныя святы кафедры.

— Дачка пайшла па бацькавым шляху?

— Вольга скончыла тэатральна-мастацкі інстытут, аддзяленне керамікі.

Ларыса Ісакаўна паказвае работы Вольгі — яны суседнічаюць з бацькавымі.

— Анатоль — манументаліст, а Вольга займаецца малой пластыкай.

— А вы, Ларыса Ісакаўна, таксама маеце дачыненне да мастацтва?

— Я «чысты тэхнар». Скончыла політэхнічны інстытут (прамысловае і грамадзянскае будаўніцтва). 13 гадоў адпрацавала ў праектным інстытуце, куды мяне накіравалі па размеркаванню. А потым перайшла ў энергакаледж на будаўнічае аддзяленне, выкладала там 32 гады, толькі летась пакінула работу.

— Дзе ж маглі пазнаёміцца скульптар і інжынер?

— Пазнаёміліся ў маёй сяброўкі. У яе ў гасцях былі Толя Анікейчык і скульптар Бора Маркаў (ён даўно ўжо ў Маскве). Была Масленіца, 22 лютага. З таго часу мы заўсёды адзначалі не дзень вяселля (бывала, і забываліся пра яго), а менавіта дзень знаёмства. Сустракаліся мы каля года, перш чым пажаніцца... Мабыць, дзякуючы таму, што я чалавек больш рацыянальны («тэхнар!»), а Толя ўзрыўны і экспансіўны, і атрымалася гарманічнае спалучэнне — той «кацёл, у якім і можна варыцца». Мне так здаецца...

— Ён расказваў аб сваіх творчых планах, раіўся?

— Мы пастаянна размаўлялі, штодзень я прыходзіла ў майстэрню. Ён прыслухоўваўся да майго меркавання. І нават калі ў першы момант катэгарычна не пагаджаўся, потым, астыўшы: «Лорка, ты маеш рацыю...».

— З якой ён сям'і?

— Нарадзіўся ў Барысаве ў 1932-м. Бацька — урач, тэрапеўт. У 1937 годзе яго забралі, тады ў адзін дзень арыштавалі шмат урачоў. У 1938 годзе Аляксандра Анікейчыка расстралялі — там жа, у Барысаве. Вельмі многа яго лёсам займаўся Толеў дзядуля Фёдар Нілавіч. Прычым ён не родны дзед: бабуля выйшла за яго замуж, ужо маючы чацвярых дзяцей. Узяў жанчыну з чатырма (!) дзецьмі і ўсіх выгадаваў... Было шмат лістоў напісана, у тым ліку Сталіну, у абарону Аляксандра Анікейчыка, але гэта не мела ніякага значэння — чалавек ужо быў расстраляны.

Маці Толі — настаўніца, выкладала рускую і беларускую мову і літаратуру. Сястра Люся (яна жыве ў Слуцку) — урач, як і бацька.

— Анатоль Аляксандравіч адзін з сям'і пайшоў у мастацтва?

— Так. І невядома, адкуль гэта ў яго: ніхто сярод родных не вызначаўся такімі здольнасцямі. Праўда, гавораць, што дзядзька Коля нешта ўмеў... Здаецца, Толя на яго нават знешне падобны — таксама «цыганісты», цёмнавалосы, з блакітнымі вачыма (хоць у сям'і пераважна ўсе светлавалосыя)...

Ляпіць Толя пачаў зусім маленькім, у дзіцячых выстаўках удзельнічаў. Курыраваў яго Заір Азгур. А маці, каб падтрымаць сына, адвяла яму спецыяльнае месца, дзе ён і ляпіў з гліны.

Пасля школы паступіў у Ваенна-транспартную акадэмію ў Ленінградзе. Вучыўся — і ўвесь час займаўся скульптурай. Адзін з выкладчыкаў, убачыўшы работы, сказаў: «Ты вучышся не па прызванню, гэта не тваё. Табе трэба займацца мастацтвам...». Анатоль паехаў у Мінск паступаць у тэатральна-мастацкі інстытут. Скульптуру здаў на «пяць», а малюнак праваліў, атрымаў двойку. Але Заір Ісакавіч Азгур настаяў, каб Анікейчыка ўзялі кандыдатам у студэнты. Не памыліўся мэтр. Праз год па малюнку ў Анікейчыка ўжо была пяцёрка... Інстытут скончыў з адзнакай, вучыўся ў А. Бембеля, А. Глебава... Выкладаў, а ў 1978 годзе стаў загадчыкам кафедры скульптуры. У яго працоўнай кніжцы запісана толькі адно месца працы — Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут: выкладчык, старшы выкладчык, потым прафесар...

— ... і народны мастак Беларусі.

— Так. Прычым званне народнага мастака ён атрымаў, не будучы заслужаным дзеячам мастацтваў. А іерархія прысвоення званняў захоўваецца дакладна...

— Як жа Анікейчыку ўдалося «скокнуць праз прыступку»?

— Да яго вельмі цёпла ставіўся Пётр Міронавіч Машэраў. Толя быў у добрых адносінах з яго дачкой Наташай, там увогуле выдатная сям'я... У 1972 годзе (акурат на Толева 40-годдзе) у Мінску адкрываўся помнік Янку Купалу. Дарэчы, Машэраў некалькі разоў прыязджаў яшчэ ў перыяд устаноўкі помніка, часам без аховы (ва ўсякім выпадку, яе ніхто не бачыў). Пётр Міронавіч усё ўважліва аглядаў, усім цікавіўся — сам ён таксама быў чалавек творчы... Пасля адкрыцця помніка мы паехалі адпачываць на Нарач. Неяк пасля снедання я слухаю радыё — і раптам сярод навін: «Анатолю Аляксандравічу Анікейчыку прысвоена званне народнага мастака Беларусі».

...А ведаеце, якая была яго рэакцыя? Ён сеў і абхапіў галаву рукамі. Кажу: гэта ж радасць, такое шчасце!.. А ён: «Лора, я ж не быў заслужаным дзеячам». А потым, калі Анікейчыку прысвойвалі званне прафесара ў 1981 годзе (дакументы ішлі праз ВАК СССР), таксама ніяк не маглі зразумець: чаму ў чалавека ёсць званне народнага мастака і няма звання заслужанага дзеяча мастацтваў!

— Анатоль Анікейчык рана пайшоў з жыцця...

— У 56 гадоў. Яго смерць была для ўсіх такой нечаканасцю...

— Усё здарылася хутка і неспадзявана?..

— Раніцай на вакзале Толя сустрэў дачку Вольгу, якая вярталася з Масквы ад сваякоў. У цягніку разам з Вольгай ехалі Гаўрыла Вашчанка з жонкай Мацільдай. Толя іх забраў. Але ўжо на вакзале адчуваў сябе няважна. Гаўрыла кажа: «Давай паедзем у клініку». А ён: «Ды якая клініка»...». Разумееце, ён мужык быў — ва ўсіх іпастасях! Якія там урачы!.. Прыехалі дахаты, пайшоў распранацца. Я зайшла ў спальню — ён белы ляжыць. Гэта секунды! Крычу: «Вольга, хуткую!». «Хуткая дапамога» не так хутка прыехала... Мы з дачкой спрабавалі рабіць штучнае дыханне. Прычым такое супадзенне — я зусім не містык, а цвярозы, прагматычны чалавек,— напярэдадні Толева сястра Люся была ў Мінску на курсах павышэння кваліфікацыі, дзе разбіраліся нечаканыя смерці мужчын (у той год такіх выпадкаў было нямала). На кухні, між іншым, яна расказвала, як трэба рабіць штучнае дыханне... «Хуткая» прыехала, урачы выклікалі машыну рэанімацыі, але ўжо было позна. Літаральна 10 хвілін — і не стала чалавека. Гэта было звышнечакана. І страшна.

— Ларыса Ісакаўна, у Нацыянальным мастацкім музеі праходзіць выстаўка Анатоля Анікейчыка...

— Яна адкрылася ў канцы чэрвеня. Выстаўка камерная. У цэнтры экспазіцыі — вялікі партрэт, які напісаў Май Данцыг. Побач — злепак рукі Анікейчыка на галінках жывога папаратніку. Бо папараць была сімвалам усяго жыцця Анікейчыка: пошук шчасця і дасканаласці... Тым больш, нарадзіўся ён праз некалькі дзён пасля Купалля.

11 ліпеня ў музеі адбудзецца вечарына памяці Анатоля Анікейчыка.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Надмагільны помнік Янку Купалу.

КЛОЎНЫ НА ДАХУ — ТАКОЕ МОЖА БЫЦЬ ТОЛЬКІ НА «БАЗАРЫ»!

Добрае, прыгожае, непаўторнае свята, што падарыла ўсмешкі дарослым і дзецям, прайшло на падворку дома-музея Шагала ў Віцебску на Пакроўскай вуліцы, у дзень, калі святкавалася 120-годдзе з дня нараджэння Мастака. Упершыню сюды прыехаў цырк. Сам Майстар так любіў гэты жанр мастацтва!

А падарыў гэты чароўны сюрпрыз «базарнаму» Віцебску Мікалай Чалнакоў — заслужаны артыст Расіі. Менавіта ён пяць гадоў таму быў аўтарам непаўторнага цыркавога прадстаўлення на... даху віцебскай Ратушы. Ён — акрабат вышэйшага ўзроўню, выступаў у лепшых цырках свету, мае самыя прэстыжныя цыркавыя ўзнагароды. Яго даўняе хобі — збіраць выявы, статуэткі клоўнаў, у выніку вылілася ў непаўторную калекцыю, у якой больш за 300 экспанатаў, зробленых з самых розных матэрыялаў. Падчас імпрэзы дзеці на спецыяльна пастаўленых пад адкрытым небам мальбертах малявалі клоўнаў. Аўтары лепшых работ атрымаюць прызы, а за перамогу ў незвычайным конкурсе — паездку ў забаўляльны парк у Еўропу з бацькамі.

Клоўны весялілі прысутных, фатаграфаваліся з дзецьмі. А напрыканцы ўсёй гэтай феерыі Мікалай Чалнакоў і яго калега паднялі спачатку на высокую агароджу музейнага комплексу, а потым — цуд — яны пайшлі яшчэ вышэй і трапілі на дах гаспадарчай забудовы музея, дзе пачалі жангляваць, паказваць самыя розныя трукі. Як здзіўляліся задаволеныя гэтым шоў гледачы! Увечары цыркачы таксама здзівілі ўсіх прысутных падчас акцыі памяці Шагала «У гасцях у Марка і Бэлы».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Віншуем з днём нараджэння ***ПЕЦЮКА Алега Уладзіміравіча.*** *Жадаем здароўя, шчасця і дабрабыту ў асабістым жыцці і на працы.*

Родныя
з в. Белагурна
Дзятлаўскага раёна.

Дзённікі бландзінкі

ШЧАСЦЕ І ГЛАБАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ

Варта было дачакацца глабальнага пацяплення... Хоць бы для таго, каб зразумець, якое гэта шчасце — гуляць па лужынах!

Крытыкі і карабінеры

На вядомым літаратурным сайце нехта задаецца пытаннем: «Што рабіць, каб крытыкі крытыкавалі?»

У сувязі з гэтым згадала італьянскія фільмы пра мафію. Там, калі ідзе сур'ёзны працэс, да суддзі прыстаўляюць карабінераў для аховы.

Крытык — той жа суддзя ў сферы эстэтыкі. Выпадкаў мардабою пакуль не ведаю, але ва ўмовах сённяшняй татальнай пісьменніцкай агрэсіі крытыку варта думаць пра ахову здароўя.

Прынамсі, мае ганарары несувымяральныя з маральнымі стратамі.

Пушкін і Рыжкоў

Была неяк вясной на беларуска-расійскай паэтычнай сустрэчы ў Пушкінскай бібліятэцы.

Трэба сказаць, што сустрэчы гэтыя мяне трохі прыгнятаюць. Арганізатары (а сярод іх цэнтр народнай творчасці) старанна спрабуюць далучыць нас да «прыгожага». Таму даводзіцца глядзець не толькі на паэтаў, але і на наклееныя каляровыя паперкі, валёнкі з жодзінскім футрам і вытканыя з воўны ваніты.

На паэтычным двубоі «Кабанаў — Прылуцкі» якраз сядзела пад такой «бязглуздзіцай» чырвона-фіялетавага колеру. Спачатку думала, што гэта вінегрэт з нейкага выйшаў. Пасля прачытала, што гэта планеты, якія наведваў маленькі прынц у Экзюперы... «Прыгожае» так вось адразу і не разгледзіш...

Гэтым жа разам віселі карцінкі зялёна-жоўценькія і ружова-блакітненькія.

Пэўна ж, вясна.

Сустрэча была файнай. Але, зноў жа, вясна, самая рамантычная пара года... Таму мат у вершах рускага паэта Жумагулава неяк не заходзіў. Асабліва ўразілі мяне радкі паэта «Справа вор, а слева бл...ь». Ну гэта ў каго якая рэчаіснасць! Асабіста ў мяне справа быў добры беларускі літаратар, а злева — выкладчыца з кафедры рускай літаратуры ўніверсітэта. Пасля вечарыны яна падзялілася са мной уражаннямі.

— Ой, благодаря этим встречам стала к мату привыкать... Сначала мучалась, а теперь вроде и ничего. Зато наш поэт был хороший! ЧИСТЫЙ ТАКОЙ МАЛЬЧИК.

Віталь Рыжкоў і праўда быў харошы. Энергетычны.

Мадыльяні і марынаваны імбір

Гляджу фільм пра Мадыльяні... Галоўны герой купляе сабе натуршчыцу за пяць франкаў у дзень. Цікава, колькі гэта ў эквіваленце?

А сёння высвятляю, што беларуская натуршчыца каштуе ўсяго два даляры. Менш за пяць тысячаў беларускіх за гадзіну стаяння без майткаў перад незнаёмым мужыком! У краіне, дзе кубак кавы ў моднай кавярні столькі каштуе...

Цяпер я п'ю каву не так сабе, а з усведамленнем таго, што некаму трэба за такі кубак дзве гадзіны голай дупай адсвяціць. А за марынаваны імбір у лядоўні мне дык і наогул соромна....

Мяне супакойваюць — яна ж за гэтыя грошы нічога не робіць!

Глупства! Нічога не рабіць — гэта і ёсць самае цяжкае.

Акапян і японцы

Згадала раніцай музей.

Карціну Акапяна (назву не памятаю), дзе на першым плане — намаляваныя простым алоўкам абрысы камянёў, а на задніх — квецень саду, прапісаная фарбамі. Мэсідж японскай хайку...

Карціну «Усё ў мінулым», дзе намаляваная старая пані, якая ціха-мірна і бязмэтна, у цяньку ўласнага дома бавіць час успамінамі... Не магу прыгадаць імя мастака...

І днямі бачанае па тэлевізары — японцы слухаюць аб'явы па радыё і ТБ: там называюць месцы, дзе яшчэ расцвіла сакура. Яны хапаюць свае гамбургеры-сушы і лятуць туды любавацца... У абедзенны перапынак.

Сучасны чалавек можа пазайздросціць старой пані...

Прыгажуны і монстры

Заходжу ў вагон метро за парай — сын і маці... І не магу ад іх позірк адвесці. Мама — вельмі прыгожая жанчына, з адкрытым і шчаслівым тварам. І сын — з мамінымі неверагодна правільнымі рысамі — мяркуючы па ўсім, слепаглуханямы. Аж слёзы на вачах.

Мінулым летам у Кіеве на Майдане да мяне падышоў малады актор. Доўга нешта гаварыў пра тэатр, а ў мяне — ніякай рэакцыі на яго прыгажосць, бо ідэальны, як манекен.

Прыгажосць таксама бывае манструознай (празмернай), а прыгажуны — монстрамі.

Язерская і раман

«Табе трэба пісаць прозу!»

Увесь час нагадваюць мне сябры. Амаль згаджаюся, але не іду далей назвы. А днямі паглядзела па АНТ, як спявае Элеанора Язерская. Асабліва кранальным было абвяшчэнне, што яна —

Прамая лінія

ЗВЯЗДА

ПОКЛІЧ КРЫВІ

З таго часу, як пастаўлена кропка ў адной з самых страшных і крывавых старонак гісторыі — завяршылася Другая сусветная вайна — прайшло ўжо больш за 60 гадоў. Але і дагэтуль людзі, раскіданыя па розных кутках зямлі, ўсё яшчэ шукаюць адзін аднаго. Вось ужо 14 гадоў ім дапамагае служба вышуку Беларускага Чырвонага Крыжа. Кожны год супрацоўнікі службы разглядаюць каля 5 тысяч зваротаў, за час яе існавання апрацавана больш за 50 тысяч пісьмаў. Гэта служба шукае, дарэчы, не толькі ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, але і тых, хто згубіўся падчас нядаўніх узброеных канфліктаў у Афганістане, Абхазіі і Чачні, а таксама тых, хто выехаў за мяжу на заробкі, і сувязь з імі перарвалася. Якім чынам Чырвоны Крыж шукае людзей, якія патрэбна мець дакументы, каб туды звярнуцца, якія шанцы на поспех — аб гэтым ішла размова падчас апошняй «прамой лініі» на Беларускім радыё, якая ладзіцца кожную сераду ў 9 гадзін 10 хвілін. На гэты раз госцем праграмы, якую разам з Максімам УГЛЯНІЦАЙ вяла журналістка газеты «Звязда» Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА, была кіраўнік службы вышуку Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Алена ДАШКЕВІЧ.

— Алена Леанідаўна, па часе мы ад Вялікай Айчыннай вайны ўсё далей. Напэўна і тых, хто згубіў на ёй сваіх сваякоў, і яшчэ спадзяецца знайсці нейкія весткі, застаецца ўсё менш?

— У параўнанні з сярэдзінай 90-х гадоў, калі наша служба была створана, зваротаў і сапраўды менш. Тады было каля 6 тысяч за год. Зараз 4—4,5 тысячы — агульная колькасць нашай карэспандэнцыі, якая ўключае лісты заяўнікаў, адказы на звароты, запыты з нацыянальных камітэтаў Чырвонага Крыжа. Маладыя супрацоўнікі таксама пытаюцца: прайшло столькі гадоў, няўжо людзі яшчэ шукаюць адзін аднаго? Тады я паказваю стосы пісем і даю іх пачытаць. І ўзнікае ўражанне, што вайна дагэтуль не скончылася. Раны на людскіх лёсах, радавых сувязях былі нанесеныя надта глыбокія: загінуў кожны трэці, больш за паўмільёна чалавек вывезена ў Германію. Сёння шукаюць ужо не бацькі, не жонкі, не сёстры і браты, а дзеці і ўнукі тых, хто прапаў, нават праўнукі. І мы заўсёды рады, калі звяртаюцца маладыя, бо гэта сведчыць пра сувязь пакаленняў.

Наша работа ўнікальная. Мы маем, напрыклад, такі напрамак, як высвятленне захаванасці воінскіх пахаванняў за мяжой. Да нас звяртаюцца не толькі людзі, але і арганізацыі: Упраўленне па ўвекавечанню памяці Міністэрства абароны, ваенкаматы, міліцыя... І калі мы бачым вынік, калі людзі праз дзесяцігоддзі знаходзяць родную магілку і едуць на яе, то разумееш, наколькі такая работа патрэбная.

— Напэўна, гэта той выпадак, калі і магілу знайсці — радасць?

— Канешне, асабліва, калі знойдзена магіла чалавека, які прапаў без вестак. Гэта вельмі сур'ёзная праблема для сям'і — поўная невядомасць пра некага з яе членаў. Яна нараджае не толькі крыўду, канфлікты паміж сваякамі, але і непаразуменне паміж пакаленнямі.

— Праз шэсць дзесяцігоддзяў пасля вайны яшчэ сустракаюцца паміж сабой жывыя людзі?

— Такіх выпадкаў не шмат, але яны ёсць. Як правіла, гэта ўжо людзі немаладыя. Нядаўна ў Брэсцкім раёне мы расшукалі пляменніц жыхара Англіі. Падчас вайны гэты чалавек хлопчыкам быў вывезены ў Германію і трапіў у брытанскую вызваленчую зону. Ён з'ехаў у Англію, там вучыўся, стварыў сям'ю, нарадзіў дзяцей. Сваіх дачок і сына назваў імёнамі сясцёр і брата, якія засталіся ў Беларусі. Такім чынам у Англіі з'явіліся Вольга, Марыя, Ганна... Вось гэтыя дзеці і звярнуліся ў Таварыства Чырвонага Крыжа, каб знайсці беларускіх сваякоў і цёзак. І мы знайшлі іх стрыечных сясцёр. На жаль, бацька ўжо не мог прыехаць, але дзеці прыехалі, пазнаёміліся са сваім беларускім родам, знялі на відэа вёску, родныя магілы, сцежкі, па якіх бегаў хлапчуком іх тата, каб паказаць яму, каб ён мог спакойна памерці... Цяпер яны прыязджаюць у Беларусь штогод.

Іншы нядаўні выпадак датычыцца Аўстраліі, дзе пасля вайны апынуўся адзін з братоў. Там у яго нарадзілася дачка, якая падала заяўку ў Аўстралійскае таварыства Чырвонага Крыжа аб пошуку беларускіх сваякоў. Мы перадалі ёй адрас стрыечных братоў і сясцёр.

Усе гісторыі ў нашай картатэцы надзвычай цікавыя, гэта каштоўны матэрыял для напісання сцэнарыяў і раманаў...

Пытанне слухача:

— Пракаментуйце, калі ласка, сітуацыю з нямецкімі пахаваннямі. У нашым пасёлку і каля яго знаходзяцца нямецкія могілкі, і не адны. Калі я была дзяўчынкай, то яшчэ бачыла на іх бярозавыя крыжы. Канешне, там пахаваны захопнікі, але ж і яны для некага бацькі і дзеці...

— Вось ужо пяць гадоў у Беларусі адкрыта прадстаўніцтва Нямецкага народнага саюза па догляду ваенных могілак. Яны якраз і займаюцца пошукам салдацкіх пахаванняў на тэрыторыі Беларусі. Можаце напісаць ім. Можаце напісаць і нам, мы перашлём ліст у гэту арганізацыю. Яшчэ адзін просты і хуткі спосаб абазначэння любых пахаванняў часоў вайны — праз райваенкамат па месцы знаходжання пахавання.

Я згодная з вамі, да любых магіл, чый бы прах там ні ляжаў, трэба ставіцца з павагай. Дарэчы, магілы савецкіх салдат у той жа Германіі і Польшчы вельмі дагледжаныя.

І мы павінны адказваць тым жа. Не так даўно да нас звярнуўся грамадзянін Германіі, які прыехаў сюды з паведамленнем аб смерці бацькі ў ліпені 1944-га пад Мінскам. Ён пажадаў наведаць любыя нямецкія могілкі часоў апошняй вайны, каб ускласці вянок у памяць пра бацьку. І мы яму парэкамендавалі такія пад вёскай Тарасава, хутчэй за ўсё, там і ляжаць той, каго ён шукаў. І нам не сорамна было накіроўваць туды гэтага чалавека. Так і павінна быць.

(Працяг будзе.)

ЖОНКУ Ў РУКІ І — НА РЭКОРД

Якія толькі віды спорту не прыдумала чалавецтва! На званне самага арыгінальнага чэмпіянату прэтэндуюць спаборніцтвы па... пераносу жонак, якія прыдумалі фіны. Паводле падання, гісторыя новага віду спорту пачынаецца з XIX стагоддзя, калі ў раёне фінскай вёскі Санкаярві дзейнічала банда рабаўнікоў: у яе, быццам, прымалі толькі тых мужчын, хто мог доўга несці любую здабычу, у тым ліку жанчын, якіх у той час часта краілі з чужых вёсак.

Упершыню спаборніцтвы па перацягванню жонак адбыліся ў 1992 годзе, а ў 1996-м яны набылі статус міжнароднага турніру. Правілы ўдзелу простыя: патрэбна пераадолець дыстанцыю (каля 250 метраў) з некалькімі бар'ерамі і воднай перашкодай як мага хутчэй, і пры гэтым несучы сваю жонку ці проста спадарожніцу жыцця. Дама не павінна быць маладзей за 17 гадоў і важыць менш за 49 кілаграмаў: калі ўдзельніца занадта худая, яе звычайна нагружаюць рукзаком.

На сёлетнім, 12-м па ліку, чэмпіянаце свету сярод 44 пар з 12 краін перамаглі эстонцы, якія ўдзельнічалі ў першынстве ў пяты раз. Вынік спадара Мадзіса Уусорга і яго жонкі Інгі склаў 61,7 секунды, але яны так і не змаглі паўтарыць сусветны рэкорд. Ён быў устаноўлены ў 2001 годзе (56,5 секунды) і належаў роднаму брату сёлетняга пераможцы. Дарэчы, стыль эстонскіх спартсменаў мае свае адметныя рысы: жанчына звычайна вісіць уніз галавой, зачапіўшыся нагамі за шыю мужчыны (іншыя партнёршы звычайна сядзяць на спіне сваіх мужоў). У падарунак Уусорг атрымаў плазменны тэлевізар і 49-кілаграмовую бочку піва (столькі ж важыць яго жонка).

Ірына АНАТАВА.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
Совместного открытого акционерного общества

«Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум – наша косметика»,

23 июля 2007 года в 16 часов 30 минут в административном корпусе СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум – наша косметика», расположенном по адресу: город Минск, улица Володько, 6 состоится внеочередное общее собрание акционеров.

Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров:
1. О проведении дополнительной эмиссии акций Общества.

Начало регистрации акционеров в 16 часов.

При себе иметь документы удостоверяющие личность и полномочия.

Наблюдательный совет
СОАО «Парфюмерно-косметическая фабрика «Модум - наша косметика».

ОАО «Минский приборостроительный завод»

проводит открытый конкурс по выбору инвестора для строительства объекта на площадке ОАО «Минский приборостроительный завод» между зданиями № 3 и № 5 по ул. Гикало.

Заказчик: Открытое акционерное общество «Минский приборостроительный завод».

Предмет конкурса: выбор инвестора для строительства объекта на площадке ОАО «Минский приборостроительный завод» между зданиями № 3 и № 5 по ул. Гикало.

Требования к участникам конкурса:
- не иметь задолженности по обязательным платежам перед бюджетами всех уровней и внебюджетным фондам, не быть убыточным;
- не находиться в процессе реорганизации и ликвидации;
- своевременно представить заявку на участие в конкурсе и пакет конкурсной документации, оформленные в соответствии с утвержденным перечнем заявительных документов.

Место получения конкурсной документации:
220005, г. Минск, пр-т Независимости, 58.

Прием заявок на участие в открытом конкурсе: до 12 часов 14 августа 2007 года.

Время и место проведения открытого конкурса (вскрытие конвертов):
15 часов 00 минут 14 августа 2007 г. по адресу: 220005, г. Минск, пр-т Независимости, 58.

Справки по телефонам: 293-04-13; 293-94-40, факс: 231-41-97.

Сёння

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.51	21.38	16.47
Віцебск —	4.33	21.35	17.02
Магілёў —	4.41	21.28	16.47
Гомель —	4.47	21.16	16.29
Гродна —	5.08	21.52	16.44
Брэст —	5.18	21.44	16.26

Імяніны

Пр. *Германа, Івана, Паўла, Сяргея;*
К. *Вольгі, Карыны, Пелагеі, Бенядзікта, Пятра*

Месяц

Маладзік 14 ліпеня
Месяц у сузор'і Блізнят

Надвор'е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+13 — +15 °C	МАСКВА	+32 — +34 °C, Без ападкаў
ВІЛЬНЮС	+20 — +22 °C, Без ападкаў	РЫГА	+22 — +24 °C, Без ападкаў
КІЕЎ	+20 — +22 °C	С-ПЕЦЯРБУРГ	+22 — +24 °C, Без ападкаў

Дзве даты

11 ліпеня

1757 год — на Слуцкую мануфактуру шоўкавых паясоў (заснавана ў 1736 годзе) быў запрошаны майстар з Івана-Франкоўска Ян Маджарскі. Менавіта ён распрацаваў новы тып пояса — слуцкі (спачатку мануфактура толькі капіравала ўзоры паясоў, прывезеных з Блізкага Усходу). Пад кіраўніцтвам Маджарскага беларускія майстры шоўкавага ткацтва надалі паясам характэрны мясцовы выгляд, уключыўшы ў арнамент нацыянальныя матывы, кветкі мясцовай флоры — васількі, незабудкі. Склаўся тып пояса — слуцкі, назва якога стала сінонімам усіх доўгіх шоўкавых паясоў. Акрамя паясоў, мануфактура выпускала шоўкавыя пакрывалы, залатыя і сярэбраныя галуны, габелены, дываны.

1903 год — нарадзіўся Рудольф Абель (Уільям Генрыхавіч Фішэр), легендарны савецкі разведчык. З 1927 года працаваў у органах дзяржаўнай бяспекі СССР. У 1957 годзе арыштаваны ў ЗША і асуджаны да 30 гадоў катаржнай турмы. У 1962 годзе быў абменены на збітага над СССР амерыканскага пілота разведвальнага самалёта Фрэнсіса Паўэрса.

Цытата дня

«Да жаніцьбы ў мяне было шэсць тэорый адносна выхавання дзяцей. Цяпер у мяне шасцёра дзяцей і ніводнай тэорыі».

Джон Уілмат.

Усміхнёмся!

90-я хвіліна футбольнага матча Германія — Саудаўская Аравія, лік 8:0. Арабскі шэйх нахіляецца да задаволенага і вясёлага бюргера, які сядзіць побач:

— Скажыце, калі ласка, колькі каштаваў у Германіі бензін паўтары гадзіны таму?

☺

Муж, якога жонка пастаянна лаяла за тое, што ён вельмі дрэнна ўсё робіць, вырашыў сам паклеіць новыя шпалеры. Зрабіў, паклікаў жонку, хваліцца:

— Вось бачыш, дарагая, як я выдатна паклеіў шпалеры? Ніводнага шва!

— Так, так... А дзе дзверы, дурань?!

☺

Ілья Мурамец стаіць на ростанях, перад ім камень, на якім надпіс:

«Прама пойдзеш — каня страціш. Направа пойдзеш — галаву страціш. Налева пойдзеш — дома прыб'ю. Твая Васіліса».

☺

— Ты хочаш стаць спявачкай?

— Не.

— Чаму?

— Мама кажа, што ў мяне ногі кароткія.

☺

Аб'ява. Тэрмінова куплю палатку з шаурмай у г. Сочы ў крэдыт на 7 гадоў.

☺

— Афіцыянт, у мяне ў супе плавае слыхавы апарат!

— Што, даруйце?..

☺

Для паступлення ў ВНУ патрэбны добрыя веды, веды і яшчэ раз грошы!

☺

— Ало! Гэта нумар 152-89-70?

— Не. Гэта 152-89-71.

— А... Ну ўсё роўна побач. Васю пакліч!



ОАО «Мостоотряд № 88»

извещает своих акционеров о проведении 23 июля 2007 г. внеочередного общего собрания акционеров.

Повестка дня собрания:

1. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Мостоотряд № 88».
2. Об оказании спонсорской помощи подшефному МОУП «Подберезье».

Собрание состоится по месту нахождения Общества: г. Минск, ул. Промышленная, 16. Начало собрания в 9 часов.

С материалами собрания акционеры могут ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 12 по 20 июля с 13 до 17 часов, а в день собрания — в помещении, где оно проводится (у председателя наблюдательного совета).

Регистрация участников собрания будет производиться с 8 часов 30 минут до 9 часов в день и по месту проведения собрания по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — по доверенности.

Наблюдательный совет.

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» РЕАЛИЗУЕТ:

АВТОМОБИЛЬНАЯ ТЕХНИКА
1. А/м УАЗ — 2000000-5200000 руб.
2. А/м ГАЗ — 2350000-4500000 руб.
3. А/м ЗИЛ — 2400000-5000000 руб.
4. А/м «УРАЛ» — 3700000-13000000 руб.
5. А/м КамАЗ — 12000000-18000000 руб.
6. А/м КрАЗ — 6300000 руб.
7. А/м МАЗ — 6000000-16000000 руб.
8. Трактор Т-150К — 4000000 руб.
9. Трактор ДТ-75 — 3700000-4100000 руб.
10. Прицепы и п/прицепы — 160000-2700000 руб.
11. Автомобильные двигатели — 1100000 руб., **а также запчасти и ремкомплекты к ним — всего порядка 100 позиций.**

ИМУЩЕСТВО РАКЕТНО-АРТИЛЛЕРИЙСКОГО УПРАВЛЕНИЯ
1. Автокран 9Т31М на ш. УРАЛ-375 — 5600000 руб.
2. Автошасси ЗИЛ-131 — 2500000-3900000 руб.
3. Автошасси КРАЗ-255Б — 5500000 руб.
4. Прицеп 1-ПН-1,5 — 125000 руб.
5. Шасси 1-П-2,5 — 480000 руб.
6. Шасси 2-ПН-2 — 500000-750000 руб.
7. Агрегат бензоэлектрический АБ-4-П/115 — 800000 руб.
8. Электростанция ЭСД-2-12 — 4500000-17000000 руб.
9. Блок питания ТБП-52 — 60000 руб.
10. Кузов-фургон КМ66ДС — 420000 руб.
11. Кабина аппаратная от изд.9С82 — 400000 руб.
12. Прицеп кабина РД-75 — 3500000 руб.
13. Прицеп ПАУ-1 (А,Б,К) — 1000000 руб.
14. Токарно-винторезный станок ИТ-1М — 6600000 руб.
15. Стол слесарный складной 165х65 — 70000 руб.
16. Тиски слесарные — 43000 руб.
17. Насос БКФ-4 — 5000 руб.
18. Мотопомпа МП-800Б — 500000 руб.
19. Устройство заряднаразрядное УЗР-15УЗ — 85000 руб.

ИМУЩЕСТВО ВВС И ВОЙСК ПВО
1. Авиационные двигатели — 10000000-340000000 руб.
2. Парашюты — 51000-1700000 руб.
3. Парашютно-тормозная система — 64000-620000 руб.
4. Парашютно-десантная жидкая тара — 411000 руб.
5. Приборы: линейки поверочные, генераторы, теодолиты, микрометры, нивелиры, контакторы, глубиномеры, реле, осциллографы и многое другое — 1900-4570000 руб.
6. Радиолокационная прицельно навигационная система КУПОЛ-II-76 — 130850000 руб.
7. Автошасси ГАЗ-66 с кунгом К-66Н — 3400000-3500000 руб.
8. Автошасси ЗИЛ-131 с кузовом-фургоном «Кунг-1М» — 3800000-4000000 руб.
9. Каток пневмоколесный прицепной ДУ-37В — 8500000 руб.
10. Каток пневмоколесный прицепной ДУ-16В — 31000000 руб.
11. Двигатель ЗИЛ-375 — 3070000 руб.
12. Раздаточная коробка АПА-5Д — 950000 руб.
13. Кислородоазотодобывающая станция АКДС-70М — 110000000-185400000 руб.
14. Автомоб. кислороднозарядная станция АКЗС-75 — 5500000-15800000 руб.
15. Аэродромный кондиционер АК-1,6-9А — 137700000-144600000 руб.
16. Кондиционер аэродромный АК-0,4-9А «Пороша» — 86500000 руб.
17. Аэродромный многоцелевой кондиционер АМК-3К — 30000000 100000000 руб.
18. Аэродромный многоцелевой кондиционер АМК-24/56 — 14400000-68900000 руб.
19. Резервуар для хран.и трансп.жидкого кислорода ТРЖК-2У — 3000000 руб.
20. Заправщик углекислотный авиационный ЗУА-1000 — 270000000 руб.
21. Газификатор сжиженных газов ГСГ-250/420 — 40500000 руб.
22. Унифицированная газозарядная станция УГЗС.МА — 57700000 руб.
23. Установка для проверки гидросистем УПГ-250 — 18000000 руб.
24. Установка для проверки гидросистем УПГ-300 — 25550000-125050000 руб.
25. Авиационный подвижной электроагрегат АПА-5Д — 42300000-202700000 руб.
26. Аэродромный передвиж. электроагрегат АПА-50М — 7450000 руб.
27. Аэродромный подвижной электроагрегат АПА-80 — 17100000-33600000 руб.
28. Агрегат электропреобразовательный авиационный АЭМГ-50М — 2490000-9500000 руб.
29. Электрогидроустановка ЭГУ-17/210 — 11900000-56000000 руб.
30. Электрогидроустановка ЭГУ-50/210-131 — 29900000 руб.
31. Унифицированная компрессорная станция УКС-400В-П4 — 5600000-41100000 руб.
32. Воздухозаправщик ВЗ-20/350 — 11800000 руб.
33. Обмывочно-нейтрализационная машина 8Т-311М — 6900000 руб.
34. Агрегат АБ-2-0/230М-1 — 160000 руб.
35. Агрегат АБ-4-Т/230М-1 — 330000 руб.
36. Агрегат АБ-4-Т/400М-1 — 420000-1300000 руб.
37. Электроагрегат АСД-20-Т/230-М2 — 1200000 руб.
38. Электростанция ЭСД 2-12 — 6800000 руб.
39. Электростанция ЭСД-30-ВС/400-М2 — 4500000 руб.
40. Кабель КМБп-4 — 45000 руб.
41. Электр. таль 0,25т — 272000-392000 руб.
42. Подвесной топливный бак — 350000-700000 руб.
43. Костюм ВК-3М — 30000 руб.
44. Редуктор хвостовой — 1200000 руб.
45. Втулка несущего винта — 6500000-57200000 руб.
46. Втулка рулевого винта — 36200000-253500000 руб.
47. Автомат перекоса — 5800000-6000000 руб.
48. Промежуточный редуктор — 18000000-27000000 руб.
49. Хвостовой вал — 20000000 руб.
50. Хвостовой редуктор — 31000000 руб.
51. Гидроусилитель КАУ-140-01 — 4000000 руб.
52. Главный редуктор ВР-2 — 17000000-37700000 руб.
53. Лопасти несущего винта Ми-2 — 5000000 руб.
54. Комплект элементов металлоконструкций СРМ-10,8хОН — 18500000 руб.
55. Покрышка (шина) 840х290 м.2А — 70000 руб.
56. Покрышка (шина) 1300х480 м.1А — 150000 руб.
57. Покрышка (шина) 840х360 м.2А — 85000 руб.

ВДС
1. Парашюты: десантные, запасные, спортивные, вышковые, ПТЛ-72 с КЗУ — 41000-90000 руб.
2. Куполы площадью: 50, 55, 83 м.кв. (без строп) — 45000-65000 руб.
3. ПГС-500 серии 2 с платформами и сотобломками — 91500 руб.
4. Подвесная система к ПГС-500 — 11000 руб.
5. Веревки вытяжные к ПГС-500 — 600 руб.
6. Мешок ПГС-500 — 1000 руб.
7. ПДСБ-1 — 50000-80000 руб.
8. Многокупольная парашютная система МКС 5-128Р в пятикупольном варианте — 2700000 руб.
9. Купола стабилизирующие парашютов Д-5 серии 2 — 8000 руб.
10. Подвесная система к парашютам Д-6 — 4000 руб.
11. Стабилизирующие системы с куполом 1,5 м.кв. к парашютам Д-6 — 7300 руб.
12. Вытяжная парашютная система ВПС-8 — 150000 руб.
13. Контейнер грузовой ГК-30Р сухопутного варианта — 14000-15000 руб.
14. Наружные наметы ПРС — 132000 руб.
15. Веревки вытяжные без предохранительных чехлов и тросов — 500 руб.
16. Веревки раскрытия к парашютам ОКС-4 — 500 руб.
17. Сумки переносные к основным парашютам — 3000 руб.
18. Сумки переносные к запасным парашютам — 3000 руб.
19. Сумки переносные к грузовым парашютам — 3000 руб.
20. Утиль капроновый — 1000 руб.
21. Парашютная платформа П-7 — 1750000 руб.
22. Парашютный прибор АД-ЗУ-Д-165 — 2000 руб.
23. Парашютный прибор ППК-У-240А-Д — 4100 руб.
24. Светомаяки СД-02-10 — 4500 руб.

ИНЖЕНЕРНАЯ ТЕХНИКА
1. Тротил в шашках по 75г с резьбовой втулкой — 7000000 руб.
2. Тротил в шашках по 200 г — 6000000 руб.
3. Тротил в шашках по 400 г — 5600000 руб.
4. Экскаватор ЭО-2621В — 16950000 руб.
5. Экскаватор ЭО-2621А — 5500000 руб.
6. Экскаватор Э-305БВ — 23000000 руб.
7. Экскаватор ЭОВ-4421 — 45000000-60000000 руб.
8. Экскаватор ЭО-3322Д — 58400000 руб.
9. Экскаватор ЭО-4111В — 31000000 руб.
10. Путепрокладчик БАТ-М — 79800000 руб.
11. Землеройная машина ПЗМ-2 — 52500000-62950000 руб.
12. Скрепер самоходный Д-357П — 15000000 руб.
13. Снегоочиститель ДЭ-220А — 20000000 руб.
14. Дизель-молот ДМ-240 — 2000000 руб.
15. Кран на пневмоходу КС-4361А — 41100000-71300000 руб.
16. Кран автомобильный КС-3572 — 34000000 руб.
17. Кран автомобильный КС-3562Б — 17500000 руб.
18. Кран автомобильный КС-2573 — 18000000-25000000 руб.
19. Кран автомобильный КС-2561Д — 11000000 руб.
20. Кран автомобильный КС-1562А — 6000000 руб.
21. Кран автомобильный TW-1031WL «WILHAG» — 11000000 руб.
22. Электропогрузчик ЭП-103-2.8У1.1 — 1900000 руб.
23. Автопогрузчик 4075 — 9000000 руб.
24. Самопогрузчик СП-5912 — 7000000 руб.
25. Самопогрузчик СП-4901 — 13000000-17000000 руб.
26. Автомобиль УАЗ-3151 — 4700000 руб.
27. Электроагрегат АД-30-Т/400М2 — 1300000 руб.
28. Электростанция ЭСД-10ВС/230-М — 3000000 руб.
29. Электростанция АЗДС-20-М2 — 1500000-6100000 руб.
30. Станция фильтровальная МАФС-3 — 14000000 руб.
31. Катер БМК-130МЛ — 39600000 руб.
32. Звено речное ПМП — 4200000 руб.

БРОНЕТАНКОВОЕ УПРАВЛЕНИЕ
1. Колесо ведущее 54.11сб-4Г — 54000 руб.
2. Радиатор водяной 432.31.001сб-1 — 213000 руб.
3. Колесо в сборе 41-3101008 КИ-80 — 95000 руб.
4. Каток в сборе 40П-3204005 — 22500 руб.
5. Коробка передач в сборе 155.08.сб-В — 390000 руб.
6. Электростанция ЭД-60-Т/230-1РП — 10000000 руб.
7. Танкоремонтная мастерская ТРМА-70 — 8300000-9000000 руб.
8. Танковый тягач БТС-2 — 20000000 руб.
9. Танковый тягач ИВБТ — 60000000 руб.
10. Балансир 54.12.2сб-6А — 20000 руб.
11. Торсионный вал 54.12.003-4А — 14000-33000 руб.
12. Амортизатор 54.14.4сб-4Б — 19500 руб.
13. Гусеница 613.44.22сб-4В — 1500000 руб.
14. Мотоцикл МВ-650М-1 — 1450000-1500000 руб.
15. Автошасси ЗИЛ-131 с кузовом-фургоном КМ-131 — 7300000-7700000 руб.
16. Двигатель В-55 — 2600000-3300000 руб.

ХИМИЧЕСКОЕ ИМУЩЕСТВО
1. А/шасси ЗИЛ-131 с/о силовой машины автодегазационной станции АГВ-3У — 9000000-9500000 руб.
2. Электроагрегат АБ-4-0/230-М1 — 800000-1000000 руб.
3. Электроагрегат АБ-2-0/230-М1 — 800000-1100000 руб.
4. Цистерна Ц-2 — 1100000 руб.
5. Установка ФВА-50/25 — 71000 руб.
6. Установка ФВА-100/50 — 140000 руб.
7. Установка ФВУА-100-Н-24Ф — 500000 руб.
8. Комплект ДК-4 — 17000-23000 руб.
9. Прибор ПРХР — 1500000-1600000 руб.
10. Рентгенметр ДП-5В — 60000 руб.
11. Прибор химической разведки ВПХР — 17000 руб.
12. Противогаз ПМГ — 7000 руб.
13. Коробка к ПМГ-2 — 1500 руб.
14. Плащ ОП-1М — 11500 руб.
15. Чулки защитные — 5250 руб.
16. Моноэтаноламин — 490 руб.
17. Порошок СФ-2У — 500 руб.
18. Ручная дымовая граната РДГ-2ч — 1000 руб.
19. Щетка сб.07-8 из к-та ДК-4 — 1000 руб.
20. Насос БКФ-4 — 9000 руб.
21. Насос 2,5 ВС-3А — 80000 руб.
22. Рукав газожидкостной сб.5сп — 7500 руб.
23. Ящик из под дымов — 550 руб.
24. Ящик ст. для СЗ — 1100 руб.

ИМУЩЕСТВО СЛУЖБЫ ГСМ
1. Резервуары — 31000-2450000 руб.
2. Масла, смазки, составы пропиточные — 200000-67400000 руб.
3. Автоцистерны АЦ — 3000000-17500000 руб.
4. Автотопливозаправщики АТЗ/АТМЗ/ТЗА — 3300000-183000000 руб.
5. ППЦ-16,3-5410 — 20000000 руб.
6. ПСГ-160/240 — 2500000-37000000 руб.
7. ВСЗ-66 — 74300000 руб.
8. МЗ-66 — 2500000-11200000 руб.
9. ПНУ-100/200 и 200-2 — 7200000-69000000 руб.
10. Мастерская сварочная МСА — 5000000 руб.
11. Дополнительный комплект к ПРМ-СГ — 5000000 руб.
12. ТММ-200 тягач К-701 — 47600000 руб.
13. ЖД цистерна ЖКЦ-35 — 19000000 руб.
14. ЖД цистерна ЖГЦ-60 — 10000000 руб.
15. Установка МНУГ-10(10М) — 65000 руб.
16. Установка МНУГ-20 — 270000-1200000 руб.
17. Установка МНУГ-60 — 280000 руб.
18. Установка МНУРГ-60 — 450000 руб.
19. Установка МНУК-50 — 1500000-6500000 руб.
20. Установка МНУМ-14 — 270000-3200000 руб.
21. Установка МНУМ-50 — 500000-900000 руб.
22. ПЦ-5,6-817 — 900000-1700000 руб.
23. ПЦ-6,7-8925 — 1600000-3000000 руб.
24. ПЦМ-6-8925 — 10000000 руб.
25. Лаборатория 8Ю-44М-1 — 240000 руб.
26. Ручной насос БКФ-4 — 6000-36000 руб.
27. ПСТР-100х1,5 — 3000000 руб.
28. Муфта аварийная ПМТ — 21000 руб.
29. Хомут ав.1-ст. 250мм — 7000-10000 руб.
30. Маном.гид.d=100/0-10 — 2200 руб.
31. Задв.ст.ПМТ-150 — 140000 руб.
32. Канистры КС-20 — 6000 руб.

ВЕЩЕВОЕ ИМУЩЕСТВО
1. Карусельный винтовой пресс для ремонта обуви ПРО-4 — 46000-61000 руб.
2. Насосная станция 2 К-6А с электродвигателем АО-2-31 — 75000-90000 руб.
3. Палатка плащ-накидка для солдат — 12000 руб.
4. Палатка УСБ-56 — 2000000 руб.
5. Ветошь х/б — 1350 руб.
6. Ветошь ватная — 1400 руб.
7. Ветошь палаточная — 1900 руб.
8. Ветошь п/ш (одеяльная) — 1800 руб.
9. Утиль войлочный — 710 руб.
10. Сапоги валяные армейские утяжеленные — 8000 руб.
11. Центрифуга КП-217Б — 900000 руб.
12. Центрифуга ЦМ-25 — 450000 руб.
13. Брезент для парной повозки из парусины брезентовой — 20000-30000 руб.
14. Автоприцеп 2-П-5,5 бортовой — 1800000-3400000 руб.
15. Палатка УСТ-56 — 1200000 руб., **а также другое вещевое имущество СА в ассортименте (фляги и котелки алюминиевые, ветошь, утиль, кители, куртки, брюки, мундиры, пальто, пилотки, фуражки) — всего более 100 наименований.**

ПРОДОВОЛЬСТВЕННОЕ УПРАВЛЕНИЕ
1. Машина посудомоечная ММТУ-1000 — 565000 руб.
2. Миска алюминиевая — 1300 руб.
3. Прицеп-фургон ОАР-2 (на прицепе 1-АП-1,5) — 570000-635000 руб.
4. Плита прицепная ПП-170 (на прицепе 1-АП-1,5) — 9220000 руб.
5. Блок хлебопекарный ПХБ-0,4 — 17900000 руб.
6. Крупорушка ПКРМ (на шасси пр-па 2-ПН-2) — 32300000 руб.
7. Просеивательная машина ПМ-60 — 700000 руб.
8. Цистерна ЦВ-1,2 на шасси прицепа 1-П-1,5 — 1500000 руб.
9. Цистерна ЦВ-50 на шасси прицепа 1-П-1,5 — 1500000 руб.
10. Термос ТВН-12 — 25000 руб.
11. Кипятильник ПНК-2 — 260000 руб.
12. Электростанция ЭСД-20-ВС/230М — 500000-6800000 руб.
13. Палатка подсобного назначения — 150000-290000 руб.
14. Палатка кухонная каркасная ПК-48 — 70000-130000 руб.
15. Палатка-цех ПМХ — 1500000 руб.
16. Форма хлебная металл. штампованная — 1500 руб.
17. Мясопункт прицепной ПМ-40 — 54300000 руб.
18. Тарелка мелкая алюминиевая — 1100 руб.
19. Бачок алюминиевый 3 литровый — 3500 руб.
20. Чайник алюминиевый 3 литровый — 7100 руб.
21. Кузов изотермический АФИ-53 — 1250000 руб.
22. Машина посудомоечная МПУ-1400 7063000 руб.
23. Прицеп-фургон ПФХ-1 — 1178000 руб.
24. Печь хлебопекарная ХПК-50М2 — 6786000-10021000 руб.
25. Передвижная кухня-столовая ПКС-3М — 13501000 руб.
26. Мельница прицепная ПМ-14 — 23081000 руб.
27. Цистерна ЦВ-4 — 89000-93000 руб.
28. Цистерна ЦВ-3 — 365000-668000 руб.
29. Контейнер изотермический КИ-50 — 370000 руб.
30. Электростанция ЭСД-10-ВС/230М — 1756000 руб.
31. Брезент под выпеченный хлеб — 18400 руб.
32. Чехол ХПК-50М2 — 115000 руб.
33. Чехол ТМ-3М1 — 125000 руб.
34. Чехол ТМ-3М1 — 103000 руб.
35. Прицеп-рефижератор ЛУМЗ-853 — 21600000 руб.
36. Макаронная установка УМ-0,4 — 26912000 руб.
37. Тестомесильный агрегат ТМ-3 — 4633000 руб.
38. Отделение ПМХ с 2-мя печами ХПК-50М2 — 40420000-42700000 руб.

МЕДИЦИНСКОЕ ИМУЩЕСТВО
1. Кресло-коляска детская «ККД-1» — 150000 руб.
2. Тележка для перевозки баллонов — 70000 руб.
3. Генератор сухого аэрозоля «АГД» — 1235000 руб.
4. Брезент размером 3,6х4,5м — 70000 руб.
5. Скамья складная — 10000 руб.
6. Столик инструментальный — 10000 руб.
7. Канистра металлическая 20л — 18000 руб.
8. Канистра полиэтиленовая 10л — 16000 руб.
9. Автоперевязочная АП-2 на а/ш ГАЗ-66 — 12700000 руб.
10. Установка дезинфекционно-душевая ДДП-2 на а/ш прицепа 1-П-1,5 — 1400000-1700000 руб.
11. Установка стериализационно-дистилля

ЭКАЛОГІЯ — ПЕРШ ЗА ЎСЁ

2-е рудаўпраўленне РУП «ВА «Беларуськалій».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З МІНІМАЛЬНЫМ УРОНАМ

Асноўная прадукцыя, якая выпускаецца вытворчым аб'яднаннем «Беларуськалій» — гэта хлорысты калій, а таксама кухонная соль. Хлорысты калій выкарыстоўваецца ў сельскай гаспадарцы як для прамога ўнясення ў глебу, так і для вытворчасці складаных угнаенняў. Попыт на прадукцыю ўстойліва высокі, вызначаецца гэта тым, што дзякуючы калійным угнаенням магчыма стварыць аптымальны ўзровень харчавання раслін і такім чынам атрымаць высокі ўраджай. Таксама сярод пераваг — узмацненне ахоўных функцый раслін. Як адзначаюць спецыялісты, пры дастатковым калійным харчаванні рэзкія перапады тэмпературы і вільготнасці (якія выклікаюць хваробы і спрыяюць з'яўленню шкоднікаў) аказваюць значна меншае ўздзеянне. Такім чынам і вызначаецца вялікі попыт на адпаведную прадукцыю. Каб яго задаволіць, неабходна арганізаваць складаную, высокатэхналагічную вытворчасць.

Старобінскае радовішча калійнай солі — адно з буйнейшых у свеце і другое па велічыні на постсавецкай прасторы. Цікавая гісторыя яго «з'яўлення». Радовішча ўтварылася каля 300 мільёнаў гадоў таму (напрыканцы дэвонскага геалагічнага перыяду). Некалі на месцы цяперашняга Палесся было мелкаводнае мора з шырокімі лагунамі. У выніку актыўных выпарэнняў і прагібаў дна падчас вертыкальных ваганняў і фарміраваліся адкладанні солі натрыю і калію, якія перамяжоўваліся з глініста-карбанатнымі «праслойкамі». Багацце Старобінскага радовішча — гэта сільвініт (вядомая ўсім калійная соль), а таксама карналіт (магнезійная соль) і каменная (харчовая) соль. Усяго выяўлена некалькі дзесяткаў калійных гарызонтаў, з іх прамысловую цікавасць уяўляюць чатыры (найбольш вытрыманыя па плошчы і магутнасці). Калійная соль знаходзіцца ўнутры пластоў каменнай. Прамысловыя гарызонты залягаюць на глыбіні ад 400 метраў да 1,2 кіламетра (іх магутнасць вагаецца ад 4 да 20 м). Здабыча калійнай солі ў Беларусі пачалася больш чым 46 гадоў таму — 9 студзеня 1961-га. Першы вагон са станцыі «Калій-1» быў адпраўлены на палетках саўгаса «10 гадоў БССР».

За гэты час здабыты больш чым мільярд тон руды, плошча падпрацоўкі (там, дзе вяліся падземныя работы) перавысіла 30 тысяч гектараў. У склад вытворчага аб'яднання «Беларуськалій» уваходзіць чатыры рудаўпраўленні (кожнае з якіх у сваю чаргу ўключае руднік для здабычы калійнай солі і абагачальную фабрыку для яе перапрацоўкі і выпуску мінеральных калійных угнаенняў). Кожны руднік вядзе распрацоўку адпаведнай часткі Старобінскага радовішча, шахтавыя палі складаюць ад 80 да 250 квадратных кіламетраў, работы вядуцца на глыбіні 350—850 метраў. Гэтыя даныя дазваляюць у поўнай меры адчуць маштабы вытворчасці. Далейшы рост яе аб'ёмаў, тэхнічнае перааўзбраенне запатрабавалі распрацоўку праектаў па аздараўленню ўмоў працы і жыцця гарнякоў, аховы навакольнага асяроддзя. Такія ўжо сусветныя тэндэнцыі: спажывец аддае перавагу экалагічна чыстай прадукцыі, вытворчасць і спажыванне якой аказвае мінімальнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе.

Генеральны дырэктар РУП «ВА «Беларуськалій» А.М. БАШУРА.

—У вырашэнні экалагічных праблем мы не стаім на месцы, а актыўна развіваемся, — адзначае генеральны дырэктар вытворчага аб'яднання «Беларуськалій» Андрэй Башура. — Раней былі такія ўмовы, што работнікі ў ботах хадзілі, многія казалі, што нават трава не будзе расці. З таго часу шмат што змянілася — створаны належныя ўмовы на вытворчасці, многае робіцца па вырашэнню экалагічных праблем. Галоўнае пры гэтым — звесці да мінімуму шкодны ўплыў на навакольнае асяроддзе. У прадпрыемства існуе свая экалагічная палітыка, яна мае дакладныя задачы, якія належным чынам выконваюцца.

Чым жа абгрунтавана такое стаўленне? Справа ў асаблівасцях вытворчасці: у выніку правядзення горных работ адбываецца прасяданне зямной паверхні, утвараецца значная колькасць вадкіх і цвёрдых адходаў. Таксама варта пільна адсочваць выкіды і скідванні, каб не дапусціць перавышэння іх нарматыўнага ўзроўню. Як вынікае з экалагічнай палітыкі вытворчага аб'яднання «Беларуськалій», прадпрыемства бярэ на сябе шэраг абавязкаў: выконваць патрабаванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь па ахове навакольнага асяроддзя; ажыццяўляць прыродаахоўную дзейнасць, накіраваную перш за ўсё на рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, ахову атмасфернага паветра і водных рэсурсаў, змяншэнне негатыўнага ўздзеяння адходаў абагачэння на навакольнае асяроддзе, ахову зямель і размешчаных на іх аб'ектаў ад негатыўнага ўздзеяння горных работ. Уся дзейнасць павінна быць скіравана на паляпшэнне экалагічнай эфектыўнасці вытворчасці і прадухіленне забруджвання навакольнага асяроддзя. Адсюль і неабходнасць папярэдняй ацэнкі тэхнагеннага ўздзеяння, і выкарыстанне адпаведных тэхналогій і абсталявання. Стан крыніц забруджвання, якія аказваюць істотнае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе, — пад асаблівым наглядам, паколькі трэба своечасова распрацоўваць і рэалізоўваць неабходныя карэктуючыя і папераджальныя дзеянні. І яшчэ адзін, на наш погляд, вельмі важны момант: вытворчае аб'яднанне «Беларуськалій» заклікае прамысловыя прадпрыемствы і арганізацыі горада да супрацоўніцтва ў пытаннях экалагічнай бяспекі Салігорскага прамысловага рэгіёна. Абгрунтаваны, сур'ёзны, узважаны, прафесійны падыход да вырашэння комплексу прыродаахоўных мерапрыемстваў — у гэтым, напэўна, галоўны сэнс экалагічнай палітыкі.

ШТО РАБІЦЬ З АДХОДАМІ?

Адной з адметнасцяў Старобінскага радовішча з'яўляецца тое, што руда, якая здабываецца, мае адносна невысокае ўтрыманне карыснага кампаненту — хлорыстага калію. Адпаведна, такая руда патрабуе абагачэння, гэты працэс адбываецца на спецыяльных фабрыках. Перапрацоўка праводзіцца флатацыйным і галургічным метадамі. Флатацыйны заснаваны на раздзяленні водараствральных мінералаў дзякуючы рознай здольнасці паверхні сільвініту і галіту змочвацца вадой, якая дасягаецца іх апрацоўкай спецыфічна дзейнічаючымі рэагентамі. Сутнасць галургічнага метаду — у ажыццяўленні працэсаў растварэння хлорыстага калію з руды абаротным растворам пры тэмпературы 120 градусаў і яго наступнай крышталізацыі падчас ахалоджвання.

Цвёрдыя галітавыя адходы (па хімічнаму складу яны на 92—95 працэнтаў — кухонная соль, астатняе прыпадае на хлорысты калій і нерастваральны астатак) на паверхні складуюцца ў солеадвалы, а вадкія шламавыя (уяўляюць сабой суспензію часціц хлорыстага калію, хлорыстага натрыю і нерастваральнага астатку ў насычаным водным растворы адпаведных соляў) — у шламасховішчы.

— Каб зменшыць колькасць адходаў і плошчу тэрыторый для стварэння адпаведных сховішчаў, прымяняецца шэраг перспектыўных тэхналогій, — заўважае галоўны інжынер вытворчага аб'яднання «Беларуськалій» Валерый Кірыенка. — Сярод іх — вышыннае складзіраванне галітавых адходаў (на вышыню больш чым 100 метраў), прымяненне селектыўных сістэм распрацоўкі, запампоўванне залішніх расолаў у глыбокія паглынальныя гарызонты, выкарыстанне галітавых адходаў у якасці тэхнічнай солі, сумеснае складзіраванне галітавых і шламавых адходаў, рэканструкцыя шламасховішчаў з мэтай павелічэння ёмістасці і падаўжэння тэрміну службы. Экалагічныя мерапрыемствы вельмі затратныя: у 2006 годзе прадпрыемства накіравала на адпаведныя мэты каля 80 млрд рублёў. Усё выконваецца за ўласныя сродкі. Урадам было прынята рашэнне аб тым, каб экалагічны падатак, які мы плацім, накіроўваўся на фінансаванне прыродаахоўных мерапрыемстваў, якія выконваюцца прадпрыемствам.

Тэхналогія вышыннага складзіравання галітавых адходаў прымяняецца на ўсіх рудаўпраўленнях. Гэта дазваляе больш рацыянальна выкарыстоўваць зямельныя ўчасткі, што адводзяцца пад солеадвалы, а таксама змяншаць колькасць залішніх расолаў (якія ўтвараюцца пад уздзеяннем атмасферных ападкаў). Зараз самы высокі пункт сярод усіх тэрыконаў складае 125,3 метра, а «па навуцы» можна рухацца і да 280 м. Ужо падчас праектавання прымяняюцца канструктыўныя меры аховы ад пранікнення расолаў у глебу. Ложы і дамбы абсталёўваюцца спецыяльнымі проціфільтрацыйнымі экранамі, а калі ўзнікае такая неабходнасць, то і дрэнажнымі сістэмамі. Дарэчы, дамбы ўзмацняюцца і пры дапамозе старых шын.

Палескія буслы — фрагмент афармлення вытворчай тэрыторыі 2-га рудаўпраўлення.

Магутная вытворчасць не парушае прыродны баланс.

Ахоўнае збудаванне на магістральным канале меліяраваных зямель.

Горнарабочы ачышчальнага забою Валерый КЕРНАЖЫЦКІ працуе там, дзе ўкаранёныя сучасныя тэхналогіі здабычы.

Схемы абаротнага і паўторнага выкарыстання вады, цяпер практычна няма выкідаў у адкрытыя вадаёмы. Такім чынам, і паветра, і воднае асяроддзе належным чынам ахоўваюцца.

ЭФЕКТЫЎНАЯ МЕТОДЫКА

Калійныя гарызонты ўяўляюць сабой чаргаванне пластоў сільвініту і галіту. Такая геалагічная будова дае магчымасць паасобнага іх здабывання з нетраў. Тэхналогія селектыўнага вымання карысных выкапняў з прадукцыйных калійных пластоў з частковай закладкай выпрацаванай прасторы разбуральным пародным праслоем разглядаецца як адно з найбольш эфектыўных прыродаахоўных мерапрыемстваў. Пры гэтым адначасова можна палепшыць тэхніка-эканамічныя і экалагічныя характарыстыкі вытворчасці. Адпаведны спосаб быў распрацаваны і запатэнтаваны спецыялістамі РУП «ВА «Беларуськалій» і ААТ «Белгорхімпрам». Пра асаблівасці методыкі расказаў галоўны гарняк другога рудаўпраўлення Сяргей Навумовіч. Разам мы наведалі падземны горны ўчастак № 7, які знаходзіцца на глыбіні 650 метраў ад паверхні. Так што інтэрв'ю адбылося глыбока пад зямлёй.

— На нашым рудаўпраўленні самая вялікая колькасць селектыўных лаў, — заўважае Сяргей Навумовіч. — Гэта эфектыўная сістэма праходкі, хоць і больш затратная. Аднак затраты апраўданыя, паколькі на перапрацоўку выдаецца больш якасная руда, адпаведна, зніжаецца колькасць адходаў. Змяншаецца прасяданне зямной паверхні, а таксама затраты на транспарціроўку і абагачэнне. Такім чынам, «плюсаў» на карысць селектыўнага вымання значна больш.

Верхні пласт сільвініту вымаецца апераджальным шнэкам, які высоўваецца на велічыню захопу. Адстаючы шнэк знаходзіцца ў стандартным стане, ён вымае ніжні пласт. Падчас адваротнага ходу вымаецца пласт галіту, які складуецца ў адпрацаваній прасторы. Як бачым, тэхналогія дазваляе комплексна вырашаць шэраг надзённых пытанняў — як вытворчых, так і экалагічных, паколькі прасяданне зямной паверхні з'яўляецца адной з найбольш вострых праблем. Як пазбегнуць абароту. Калі такія мерапрыемствы не выконваць, то «праблемныя» землі хутка пераўтворацца ў дрыгву альбо на гэтым месцы можа ўтварыцца нават возера. На «Беларуськаліі» не падыходзяць фармальна і да зваротаў насельніцтва: калі чалавеку сапраўды патрабуецца дапамога, то неабходныя работы выконваюцца. Гэта датычыцца перасялення ў іншыя населеныя пункты (калі ўзнікла такая патрэба), узмацнення дамоў, якія знаходзяцца на тэрыторыі падпрацоўкі, устаноўкі калонак і г.д. Такім чынам, інтарэсы людзей заўсёды пад пільнай увагай.

Галоўны інжынер РУП «ВА «Беларуськалій» В.М. КІРЫЕНКА.

МІЖНАРОДНАЕ ПРЫЗНАННЕ

Для выканання нарматываў па выкідах выкарыстоўваюцца сучасныя сістэмы пылегазаачысткі. Як заўважыла начальнік цэнтральнай санітарнай лабараторыі «Беларуськалія» Тамара Уласевіч, ЦСЛ выконвае значны аб'ём работ па маніторынгу і вымярэнню параметраў. Цэнтральная лабараторыя акрэдытавана на тэхнічную кампетэнтнасць па 26 аб'ектах выпрабаванняў (пітную ваду, прыродныя, паверхневыя, сцёкавыя воды, а таксама паветра прамысловых выкідаў і інш.). Увогуле ж, паведаміла Тамара Уласевіч, кантроль аб'ектаў навакольнага асяроддзя праводзіцца па 75 (!) паказчыках, так што сітуацыя адсочваецца і аналізуецца дасканальна. Паспяховаму выкананню сістэмы прыродаахоўных мерапрыемстваў спрыяе тое, што на прадпрыемстве сфарміраваны моцны кадравы патэнцыял — так лічыць намеснік генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання «Беларуськалій» Анатоль Махлай.

У маі 2000 года аб'яднанне прыступіла да распрацоўкі і ўкаранення сістэмы кіравання навакольным асяроддзем на адпаведнасць патрабаванням ISO 14001:1996. У студзені 2002 года сістэма экалагічнага менеджменту была сертыфікавана міжнародным органам па сертыфікацыі. У лютым 2005 года праведзены рэсертыфікацыйны аўдыт СУОС і выдадзены сертыфікат адпаведнасці СУОС патрабаванням ISO 14001:2004. Гэта прызнанне той вялікай і працоўнай работы па ўвасабленню сістэмы прыродаахоўных мерапрыемстваў, што выконваецца на «Беларуськаліі». Прызнанне і пацвярджэнне таго, што разам з развіццём вытворчасці экалогія — перш за ўсё.

Прыродаахоўная дзейнасць РУП «ВА «Беларуськалій» атрымала самае высокае прызнанне.

Намеснік генеральнага дырэктара па кадрах і ідэалагічнай рабоце А.У. МАХЛАЙ.

Захар БУРАК, Віктар ПАЗНЯКОЎ. Фота і вершы Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Творчая брыгада «Звязды» выказвае падзяку за тэхнічную дапамогу выхаду ў свет гэтай публікацыі намесніку генеральнага дырэктара па камерцыйных пытаннях і лагістыцы А.У. ВАСІЛЕВІЧУ, загадчыцы аддзела маркетынгавых даследаванняў і аналізу продажу Н.А. МІРАШНІЧЭНКА, эканамісту Т.А. МУЛЯРЭВІЧ.

Якасць вады для вытворчых патрэб — пад надзейным кантролем, — засведчыла лабарант пятага разраду санітарнай лабараторыі Таццяна ЗАСІМОВІЧ.

«Старыя» аўтапакрышкі знайшлі сваё прымяненне — для ўмацавання дамбы шламасховішча, — зазначыў намеснік галоўнага інжынера па ахове навакольнага асяроддзя Валерый ЧУРАЎ.



ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (новая версія, якая тэсціруецца)
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 34.118. Індэкс 63850. Зак. № 3714. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12